Калгаснай вясьне--бальшавіцкі сустрэчны плян сяўбы!

Пралетарыі ўсіх краін, злучайцеся! פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט זיך! Пролетарии всех стран, соединяйтесь! Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

XII ГОД ВЫДАНЬНЯ

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

ОРГАН Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ і Савету Народных Камісараў Б. С. С. Р.

ПАНЯДЗЕЛАК 23 САКАВІКА 1931 ГОДУ. № 66 (3155)

Загатоўку лёнанасеньня—на ўдарныя тэмпы

ПОУНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ ПАСЕУНЫ ПЛЯН ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР

Скарыстаць санную дарогу—забясьпечыць дастаўку насеньня

ТРЫВОЖНЫЯ СЫГНАЛЫ З ФРОНТУ ПАСЕВУ ТЭХНІЧНЫХ КУЛЬТУР

У бой за тэхнічныя культуры!

На базе разгорнутага наступленьня на ўсім фронце, на аснове будаўніцтва саўгасаў і калгасаў мы шчыльна падышлі да практычнага вырашэньня задач ажыцьцяўленьня ідэі спэцыялізацыі сельскай-гаспадаркі БССР. Трэці год пяцігодкі зьяўляецца годам, які павінен забясьпечыць далейшы шпаркі рост разьвіцьця тэхнічных культур. Надыходзячая другая бальшавіцкая пасеўкампанія павінна зьявіцца вясной рашаючага пералому для ўсіх раёнаў тэхнічных культур.

На аснове разгорнутага будаўніцтва буйных саўгасаў і калгасаў, на аснове правядзеньня пляну кантрактацыі яравых мы маем магчымасьць у трэцім годзе пяцігодкі ў асноўным вырашыць пастаўленыя партыяй і ўрадам задачы сацыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі.

Рэзкі пералом у бок разьвіцьця саўгасаў і калгасаў дае нам магчымасьць у трэцім годзе пяцігодкі ажыцьнявіць задачы спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі БССР, ператварэньня БССР у рэспубліку лёну, канапель, малочнай жывёлагадоўлі і свінагадоўлі.

Праграма другой бальшавіцкай вясны патрабуе забясьпечыць рашучы пералом у разьвіцьці ільнаводства і канапляводства. У параўнаньні з мінулым годам плошча пад лёнам павінна быць пашырана на 53 проц. і пад канаплямі на 85 проц.; у асноўных ільнаводных раёнах плошча пад лёнам павінна быць даведзена ад 15 да 30 проц. агульнай пасеўнай плошчы. Такава праграма другой бальшавіцкай вясны ў разьвіцьці тэхнічных культур.

Для ажыцьцяўленьня гэтай праграмы патрабуецца узмоцненая работа на арганізацыі спэцыялізаваных ільнаводных саўгасаў і калгасаў, а таксама канапэраваньне бядняцка-серадняцкіх гаспадарак ільнаводных раёнаў у спэцыяльныя вытворчыя таварыствы. Да пачатку сяўбы неабходна поўнасьцю забясьпечыць саўгасы і калгасы ільнаводных раёнаў мінэральнымі ўгнаеньнямі, ужыць захады да мэханізацыі працэсаў засеву, уборкі, абмалоту і першапачатковай апрацоўкі лёну і канапель.

Пашырэньне пасеўплошчы тэхкультур у вясеньнюю пасеўкампанію, мэханізацыя уборкі, абмалот і першапачатковая апрацоўка вось асноўныя задачы разьвіцьця тэхкультур.

Студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б, надаючы асаблівае значэньне спэцыялізацыі раёнаў, падкрэсьліў, што «у адпаведнасьці з устаноўленым раёнаваньнем БССР правесьці рэзкую спэцыялізацыю саўгасаў і калгасаў адначасова ўцягнуўшы ў гэту справу бядняцка-серадняцкія масы аднаасобнікаў».

Гэтая дырэктыва партыі павінна быць рэалізавана поўнасьцю.

Адным з мерапрыемстваў, стымулюючых спэцыялізацыю раёнаў у ільнаводным напрамку, зьяўляецца кантрактацыя яравых культур. Плянам кантрактацыі ў бягучым годзе прадугледжана закантрактаваць плошчу ільну 190 тыс. га і 18 тыс. га канапель. Гэта лічба павінна быць выканана.

Савет Народных Камісараў БССР і Цэнтральны Камітэт КП(б)Б заклікаюць усе партыйныя, савецка-гаспадарчыя, каапэрацыйныя, калгасныя і камсамольскія арганізацыі ўзяцца па бальшавіцку за справу кантрактацыі яравых пасеваў, мабілізаваць свае сілы і растлумачыць масам рабочых, калгасьнікам, бядняцка - серадняцкім масам вёскі значэньне правадзімых Савецкаю Ўладаю мерапрыемстваў па тэхнічным пераўзбраеньні і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, стаць на чале новага ўздыму калгаснага руху мільённых мас вёскі і забясьпечыць гэтым самым рашаючыя посьпехі ў справе ліквідацыі кулацтва як класы і сацыялістычнай перабудовы вёскі». З адозвы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб кантрактацыі яравых).

Прагрэмай другой бальшавіцкай вясны сёлета намечана заняць пад лён 240 тыс. га і 43 тыс. га пад канаплі. Вызначаная лічба пашырэньня засеву плошчы тэхкультур вымагае ад нас належнай падрыхтоўкі і чоткасьці ў рабоце. Аднак на сёньнешні дзень мы на жаль ня можам пахваліцца гатоўнасьцю да сяўбы, асабліва ў рэалізацыі праграмы тэхкультур. У радзе мест заданьне пашырэньня плошчы засеву тэхкультур ганебна зрываецца. Апартуністычная недаацэнка пашырэньня плошчы тэхкультур стварае пагрозу зрыву пляну спэцыялізацыі раёнаў.

Факт, які мы сёньня падаем на старонках нашай газэты аб скарачэньні плошчы засеву тэхкультур у Плешчаніцкім, Крупскім і Парыцкім раёнах, інакш нельга разглядаць як праяву правага апартунізму ў правядзеньні другой бальшавіцкай вясны.

Імкненьнем скарачэньня засеву тэхкультур трэба даць належны адпор. З гэтымі імкненьнямі трэба змагацца з усёй рашучасьцю. Баявое заданьне партыі і ўраду павінна праводзіцца ня ўкільна.

Ажыцьцяўленьне задач спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі ў значнай меры залежыць ад мабілізацыі насенных рэсурсаў. На жаль нашыя загатоўчыя арганізацыі з гэтай задачай спраўляюцца дрэнна. На сёньнешні дзень надзвычайна востра стаіць справа забясьпечаньня веснавой сяўбы насеньнем тэхкультур, асабліва насеньнем канапель і лёну. Мясцовыя загатоўкі разгорнуты слаба. Дрэнна пастаўлена справа ўнутранай перакідкі насеньня тэхкультур. У справе загатоўкі насеньня тэхкультур трэба дабіцца неадкладнага пералому.

Другая бальшавіцкая сяўба павінна праводзіцца пад знакам узмоцненнага росту ўдарніцкага руху, уздыму вытворчых сіл вёскі, будаўніцтва саўгасаў і калгасаў. На ажыцьцяўленьне гэтых задач павінна быць мабілізавана ўся грамадзкая думка. Трэба узьняць на належную вышыню вытворчую ініцыятыву рабочых мас саўгасаў, калгасьнікаў і шырокія бядняцка-серадняцкія масы аднаасобнікаў.

Мы стаімо за цьвёрдыя нормы выпрацоўкі, за дакладны вучот, за працоўную дысцыпліну

Наша арцель «Поўны Шлях» да веснавой сяўбы падрыхтавалася як у сэнсе стварэньня насеннага фонду, так і разьмеркаваньня працоўнай сілы. Калгас пад яравы клін вызначыў засеяць 183 га, з іх 85 га аўсу, 10 га лёну, 2 канапель, 15 га бульбы, 20 га ячменю, 5 га пшаніцы, 5 га лубіну і 10 га вікі. Для засеву гэтай плошчы загатавана і ачышчана 20 тон аўсу, 2,5 тоны ячменю, 1 тона пшаніцы, 2,5 цэнт. канапель, 1 тона ільна-семя і 24,5 тоны бульбы.

Сельска-гаспадарчыя машыны, ужо здрэмантаваны. Створаны кармовы фонд. Рабочая сіла разьбіта на брыгады па 15 асоб. Брыгады будуць пасылацца на ворыва, вывазку гною, баранаваньне; вольныя ад работы брыгады будуць скарыстаны на будаўніцтве. Устаноўлены цьвёрдыя нормы выпрацоўкі (зьдзельшчына) так: ворыва параконным плугом 0,75 га ў 10-гадзінны дзень, вывазка гною 15 вазоў у дзень і г. д. Брыгадзір штодня будзе весьці вучот выпрацоўкі.

Заключаны дагавор з МТС, якая дапаможа з большым посьпехам правесьці веснавую сяўбу. П. Ш.

Бярэце прыклад з калгасу „Камунар"

Дырэктывы партыі і ўраду аб пашырэньні плошчы і выкананьні пляну тэхнічных культур калгасам «Камунар» будуць выкананы поўнасьцю.

Паводле зададзеньня па тэхнічных культурах патрэбна засеяць 2 га канапель, 8 га лёну і 80 га бульбы. Калгасьнікі, абгаварыўшы на агульным сходзе пляны засеву ў другую калгасную вясну, цалкам прынялі пляны і практычна прыступілі да ажыцьцяўленьня іх.

Ужо поўнасьцю загатоўлена і ачышчана насеньне, адрамантаваны 13 плугоў, 3 церкі, 2 сеялкі, 4 веялкі і рад іншых с.-г. машын. Мяркуецца пашырыць плошчу тэхнічных культур за кошт скарачэньня папару і распрацоўкі пустыроў.

Бажун.

Марудзяць з загатоўкай насеньня

Багушэвіцкі раён у другую калгасную вясну павінен пашырыць плошчу правога кліну на 21 проц., з якіх 15 проц. па тэхнічных культурах, за кошт скарачэньня папару і распрацоўкі балот і іншых няўжытковых зямель.

Тэхнічных культур у раёне мяркуецца засеяць 228 га канапель і 2488 га лёну. Дрэнна ідзе загатоўка насеньня па тэхнічных культурах.

Загатоўлена лёну 920 цэнт., а яго паводле пляну патрэбна загатовіць 1110 цэнт., канапель—0,5 цэнт., а патрэбна 15,5 цэнт. Загатоўка насеньня праходзіць марудна, сельсаветы бязьдзейнічаюць.

Дрэнна і загатоўкай мінэральнага угнаеньня. Раён атрымаў усяго 2 вагоны касьцяной мукі і 8 вагонаў фасфарыту, што ні ў якім выпадку не забясьпечвае патрэбы раёну.

Ульмашэвіч.

СКАРЫСТАЦЬ УВЕСЬ ПАПАР

Сураскі раён зьяўляецца адным з лёнаводных раёнаў БССР. Сёлета ў раёне намечана пашырыць пасевы па тэхкультурах да 6.214 га супроць 2.940 га у мінулым годзе. У калгасным сэктары пад лён мае быць занята 1.111 га.

Насеньнем лёну раён цалкам забясьпечаны. Два вагоны лёну нават перакінуты ў суседні Межанскі раён. Пляны пасеву даведзены да кожнага калгасу, да аднаасобных гаспадарак на 65 проц. Насеньне ў калгасах ачышчана на 100 проц., у аднаасобнікаў—на 80 проц.

Завезенае ўгнаеньне разьмеркавана. Вельмі дрэнна абстаіць справа з вапнай. Да гэтага часу нічога ня зроблена па завозу вапны ў калгасы. Вапельня знаходзіцца на далёкай адлегласьці (60 клм.), таму ёсьць пагроза, што ў веснавы пэрыяд ня будзе выканаць плян па вапнаваньні.

У веснавую сяўбу ня хопіць радкавых сеўнікаў. Трэба ў раён завезьці 10 дванаццаціраддкавых дзіскавых сеўнікаў.

У Сураскім раёне ў надыходзячую весну мае быць заняты ўвесь папар пад пасеў кармовых траў, як віка, сэрадэля і інш. Між тым, да гэтага часу нічога ня зроблена па завозу насеньня траў. У раён адгружана віка выключна для пасеву на насеньне.

Тав. Казакевіч. Калгас «Ленінскі Шлях» (Койданаўскі р.) член ЦВК ССР, дэлегат зьезду.

Трэба абавязкова завезьці 500 цэнт. насеньня на кармовую віку. Таксама да гэтага часу не атрымана насеньне сілосных культур. З гэтым пытаньнем трэба пасьпяшацца.

Ігнатаў.

Злачынна зрываецца плян вапнаваньня

(Гутарка з старшынёю Баркавіцкага Райкалгассаюзу тав. Лапаціным).

Сёлета па раёне намечана заняць пад лён 1.934 га—павялічэньне супроць мінулага году на 30 проц. Дрэнна абстаіць справа з забясьпечаньнем гэтай плошчы патрэбнай колькасьцю насеньня. Не хапае 1.333 цэнт. насеньня. Насеньне адгружаецца, але ёсьць пагроза, што яно будзе атрымана вельмі позна ў час разводзьдзя. Да гэтага часу ачышчана 75 проц. усяго наяўна га насеньня.

З другіх культур ня хопіць насеньня бульбы (4.110 цэнт.), канюшыны (240 цэнтн.).

Рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтара выканана на 90 проц. Цягавай сілай калгасы забясьпечаны. Вельмі востра стаіць пытаньне з кармамі для жывёлы. Асабліва не хапае грубых кармоў. Трэба ўжыць рашучыя захады, каб забясьпечыць калгасы кормам.

У сучасны момант у раёне адчуваецца вялікі недахоп запасных частак да с.-г. машын, асабліва лемяхоў да двух парных плугоў. Трэба зьвярнуць увагу на завод лемяхоў.

Справа з вапнаваньнем абстаіць вельмі дрэнна: ляжыць 2.280 цэнтн. вапны, а забрана ўсяго 240 цэнтн.

На зьлёце ўдарнікаў сьвінагадоўчых саўгасаў

Ужо трэці дзень у Менску засядае першы Ўсебеларускі зьлёт ударнікаў сьвінагадоўчых саўгасаў. На дзённым пасяджэньні 21 сакавіка зьлёт заслухаў даклад старшыні БРК саюзу сельгасрабочых тав. Манжалея аб сацспаборніцтве, ударніцтве, рабоце вытворчых нарад і задачах ударнікаў.

У сваім дакладзе тав. Манжалей з усёй рашучасьцю падкрэсьліў, што сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў сьвінагадоўчых саўгасах пастаўлена вельмі дрэнна. Ударная работа, якая стаіць перад саўгасамі, ў час правядзеньня другой бальшавіцкай вясны высоўвае перад партыйнымі і прафэсыянальнымі арганізацыямі саўгасаў. баявыя задачы: шырэйшага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, пераходу ад індывідуальнага ўдарніцтва да ўдарных брыгад і арганізацыі скразных брыгад у саўгасах.

Вытворчыя нарады павінны быць рашуча перабудаваны. Трэба дабіцца, каб вытворчыя нарады сталі асновай разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Вялікая ўвага павінна быць звернута на праверку і вучот дагавораў па сацспаборніцтву, зварочваючы ўвагу ня толькі на колькасныя паказьнікі, але і на якасны зьмест ударніцтва.

21-III адбыўся вечар вытворчай змычкі ўдзельнікаў зьлёту з рабочымі прадпрыемстваў Менску. Пасьля ўступнага слова тав. Манжалея, былі заслуханы рапарты асобных саўгасаў і заводаў, у якіх рабочыя прадпрыемстваў абменьваліся вопытамі сацыялістычнай працы з рабочымі саўгасаў. Выступалі з рапартамі ад сьвінагадоўчых саўгасаў — саўгас Вішнёўка, імя Першага Мая і «Вызваленьне». Ад фабрык і заводаў Менску рапартавалі завод «Бальшавік», «Энэргія», «Ударнік» і «Полымя Рэвалюцыі». Зьлёт ударнікаў вітала дэлегацыя падшэфнага саюзу сельгасрабочых палка АДПУ і дэлегацыя зьезду калгасьнікаў.

На раніцнім пасяджэньні 22-III адбыліся спрэчкі па дакладу тав. Манжалея, пасьля чаго зьлёт заслухаў даклад тав. Лашкевіча аб арганізацыі працы ў саўгасах.

Забясьпечыць выкананьне пляну пасеву тэхнічных культур

Сёлета ў БССР плошча пад тэхнічныя культуры значна пашыраецца. Пад лён намечана заняць 240.000 га супроць 130.000 га ў мінулым годзе, пад канаплі — 40.000 га (летась 21.000 га). У саўгасах Ільна-канаплятрэсту намечана пасеяць 2.000 га лёну і 3.000 га канапель. Калгасы павінны засеяць 85.859 га лёну і 13.000 га канапель. Калі летась лён у калгасах займаў 4,3 проц. у параўнаньні да ўсіх с.-г. культур, дык зараз гэты процант павялічваецца да 10,3 проц.

Такое значнае павялічэньне плошчы пад тэхнічныя культуры вымагае ад усіх арганізацый належнай падрыхтоўкі і выразнай чоткасьці ў рабоце. Пакуль што ў галіне падрыхтоўкі да сяўбы тэхкультур маюцца значныя прарывы. Да апошняга часу нявыразна стаіць пытаньне з завозам насеньня, ня ўсюды прыняты кантрольныя плошчы пад пасевы тэхкультур. Некаторыя раёны самавольна скарачаюць плошчы пасеваў тэхкультур па калгаснай сыстэме.

Крупскі раён скарацілі плошчы пад тэхкультуры на 712 га, Плешчаніцкі раён таксама значна скараціў плошчу пад працаёмкія культуры. У Парыцкім раёне значна скарацілі плошчы пад тэхкультуры калгас «Чырвоны Сьцяг» і калгас у м. Шчэдрын.

Сбор сродкаў на пабудову самалёта «Калгасьнік Беларусі» сярод дэлегатаў зьезду.

Гэтыя прыклады сьведчаць аб тым, што ў некаторых мясцох існуе апартуністычная недаацэнка пытаньня пашырэньня плошчы пад тэхнічныя культуры і наогул да разьвіцьця тэхкультур. Трэба сурова змагацца з падобнымі праявамі правага апартунізму на практыцы, якія падрываюць нармальную падрыхтоўку да веснавой сяўбы і не забясьпечваюць поўнае выкананьне кантрольных лічбаў па тэхкультурах. Другім, ня менш важным пытаньнем зьяўляецца забясьпячэньне насеньнем тэхкультур. Асабліва востра стаіць пытаньне забясьпячэньня насеньнем канапель — не хапае 6550 цэнт. насеньня канапель. Таму, тут трэба зараз-жа ўжыць усе захады, каб знайсьці патрэбную колькасьць насеньня канапель.

Пакуль што нездавальняюча абстаіць справа з завозам у межы БССР насеньня лёну. На 10-III г.г. завоз насеньня выкананы ўсяго на 9 проц., да 1 красавіка абяцаюць поўнасьцю закончыць адгрузку насеньня. Але хутка зусім прападзе дарога і насеньня лёну нельга будзе перавезьці ў гаспадаркі. Апроч гэтага ёсьць пагроза, што ня ўсё насеньне будзе ачышчана, калі яно будзе атрымана вельмі позна. Да гэтага трэба дадаць, што не хапае тары для перавозкі насеньня тэхкультур, трэба дабіцца, каб тара была завезена як хутчэй.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на мясцовыя загатоўкі і на ўнутраную перакідку насеньня. Ёсьць рад раёнаў, якія злачынна адносяцца да пытаньня загатоўкі насеньня. У Нараўлянскім раёне насеньня тэхкультур не хапае, у гэты-ж самы час Райкаапсаюз нічога ня робіць па загатоўках насеньня лёну і канапель.

Таксама дрэнна пастаўлена работа па стварэньні насенных фондаў тэхкультур і па Магілеўскім раёне. Апроч таго, да апошняга часу ня скончана яшчэ ўнутраная перакідка насенных фондаў. Трэба дабіцца, каб перакідка насенных фондаў была закончана ў самы кароткі час, каб выкарыстаць санную дарогу.

Значнае пашырэньне плошчы тэхкультур вымагае максымальна мэханізаванай сяўбы і ўборкі ўраджаю. Сёлета намечана завезьці да пачатку сяўбы 200 сеўнікаў, трэба дабіцца, каб плян завозу сеўнікаў быў выканан сваячасова і поўнасьцю.

Апроч таго, трэба зараз-жа пачаць падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі. Для БССР вызначана 500 лёнацерабілак (летась было завезена толькі 27) і 342 машыны для абчэсваньня галовак лёну. Нашы снабжэнчыя арганізацыі павінны прасачыць за тым, каб усе ўборачныя машыны былі завезены сваячасова і поўнасьцю.

К. І.

Сустрэчнымі плянамі сяўбы сустракаем вясну

(ГУТАРКА З СТАРШЫНЁЮ ЛЁЗЬНЕНСКАГА РАЙКАЛГАССАЮЗУ тав. ШЭНБЭРГАМ).

Плошча пад пасевы лёну ў раёне значна пашыраецца. Сёлета намечана заняць пад лён 6.550 га (летась 4.000 га), калгасы займаюць пад лён 1400 га.

Насеньнем лёну раён цалкам забясьпечаны. Насеньне ў калгасах ачышчана на ўсе 100 проц., у аднаасобным сэктары на 45 проц.

Плян сяўбы даведзены да ўсіх гаспадарак. Некаторыя калгасы высунулі сустрэчныя пляны, у якіх плошча пад лён значна павялічваецца. Угнаеньнем калгасы забясьпечаны на 75 проц. Слаба абстаіць справа з тым угнаеньнем, якое занараджана непасрэдна ў калгасы.

Да гэтага часу калгасы забралі ўсяго 40 проц. усёй патрэбнай вапны. Гэта ставіць пад пагрозу выкананьне пляну вапнаваньня глебы.

Трэба зараз-жа падумаць аб падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі. Летась было ў раёне 4 лёнацерабілкі, сёлета неабходна завезьці яшчэ 15 лёнацерабілак. Рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтара закончаны. З Віцебску прыехалі тры брыгады з заводу Мэтпрому, якія прывезьлі сваё жалеза, свае прылады і цалкам скончылі ў працягу 6 тыдняў рамонт усіх машын.

Загатоўкі па лёне выкананы на 96 проц.

Рашуча ўзмацніць загатоўку лёнанасеньня

Тэхнічныя культуры маюць вялікае значэньне ў нашай сацыялістычнай гаспадарцы. Плошча пад засевам тэхнічных культур (лёну, канапель) сёлета значна павялічваецца ў параўнаньні з мінулым годам.

Лёну і канапель павінна быць засеяна амаль ў 2 разы больш проці леташняга, як у саўгасах і калгасах, так і ў індывідуальным сэктары.

Для таго, каб забясьпечыць поўнае выкананьне гэтага пляну засеву тэхнічных культур, неабходна мець, у першую чаргу, адпаведную колькасьць насеньня. А вось яго якраз і не хапае ў БССР.

Поруч з галоўнымі лёнаводнымі раёнамі, якія маюць насеньне ня толькі для засеву сваіх плошчаў, але і для вывазу ў іншыя мясцовасьці, шмат раёнаў упяршыню пачынаюць разводзіць лён і, такім чынам, свайго насеньня ня маюць.

Каб задаволіць усе раёны патрэбнаю колькасьцю насеньня лёну і канапель, трэба ў першую чаргу мабілізаваць усе нашы ўнутраныя рэсурсы насеньня. Такімі рэсурсамі зьяўляюцца, галоўным чынам, загатоўкі. Загатоўчыя арганізацыі на мясцох павінны зразумець, якое вялікае значэньне мае сваячасовае і поўнае выкананьне плянаў загатовак лёну і канапель у справе забясьпячэньня насеньнем плошчаў, пад засевам тэхнічных культур. Нельга марудзіць ніводнай хвіліны; трэба памятаць, што забясьпячэньне нашай прамысловасьці мясцовай сыравінай залежыць ад посьпехаў бальшавіцкай сяўбы, а вось адною з умоў правядзеньня гэтай сяўбы зьяўляецца паўнасьць належнай колькасьці насеньня, якое павінна быць сабрана на мясцох загатоўчымі арганізацыямі.

БССР зьяўляецца цэнтрам разьвядзеньня лёну. Яна павінна быць крыніцаю для чэрпаньня насеньня лёну і для іншых нашых рэспублік. І калі сёлета нам даводзіцца часткова прывезьці насеньне лёну з па-за межаў БССР (5.923 тоны), з Ленінградзкай і Заходняй вобласьцей, дык гэта ня значыць, што можна паслабіць загатоўкі гэтага насеньня ў нас на мясцох.

Адгрузка насеньня нам з Ленінградзкай вобласьці ідзе даволі пасьпяхова і неўзабаве наша заяўка ў 898 тон будзе выканана. Рэшта-ж насеньня лёну завозіцца з Заходняй вобласьці. Тут нам трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на выкананьне пляну завозу, бо з усёй колькасьці належнага нам насеньня лёну (каля 5 тыс. тон) на 10 сакавіка адгружана толькі 422 тоны. Прычынай, якая затрымлівае сваячасовую адгрузку лёну, зьяўляецца ў першую чаргу недахват насеннячышчальных машын на месцы (Смаленшчына павінна адгрузіць чыстага насеньня лёну для розных вобласьцей 300.000 тон). Часам гэта вымушае адгружаць лён не пасеўчай чыстаты, а толькі таварнай, што, бязумоўна, адб'ецца на якасьці ўраджайнасьці. Апроч таго, затрымліваецца адгрузка яшчэ і недахватам тары (мяхоў).

Вось гэтыя, з першага погляду малаважныя, прычыны ствараюць пагрозу ў выкананьні намі намечаных плянаў засеву тэхнічнай культуры лёну.

Гэта яшчэ раз гаворыць аб тым, што мы павінны асаблівую ўвагу аддаць нашым загатоўкам лёнасемян на мясцох, каб забясьпечыць выкананьне плянаў засеву лёну. Г. Ш.

Не ў авангардзе, а ў хвасьце

ўдарных тэмпаў пляцецца Лельчыцкая партячэйка

Ужо шмат пісалася на старонках друку аб правааапартуністычнай дзейнасьці некаторых парт'ячэек Лельчыцкай райпартарганізацыі. Але ня гледзячы на гэта права-апартуністычная практыка ў рабоце некаторых парт'ячэек наглядаецца і зараз. Узяць хоць для прыкладу Лельчыцкую парт'ячэйку, якая бязьдзейнічае ў справе калектывізацыі, падрыхтоўкі да калгаснай вясны, у правядзеньні палітычна-гаспадарчых кампаній.

Права-апартуністычная практыка наглядаецца і ў тым, што кіраўніцтва ячэйкі, як відаць, ня хоча сварыцца з кулаком. Пад носам парт'ячэйкі кулацкая гаспадарка, якая павінна здаць у парадку дачы цьвёрдага заданьня па хлебазагатоўках—2 тоны збожжа, на сёньняшні дзень здала ўсяго толькі 2 цэнтнэры. Справа з падрыхтоўкай да веснавой сяўбы знаходзіцца ў катастрафічным становішчы. Пляны сяўбы не даведзены да калгасаў і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Зёрначышчэньне правальваецца.

Няма работы з батрацтвам і беднатой. Калгасны прыліў ідзе надта слаба. За апошні час па 6 калгасах уступіла толькі 15 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Работа па клясава-інтэрнацыянальным выхаваньні ячэйкай не праводзіцца. Маецца праява антысэмітызму з боку некаторых партыйцаў (калгас імя Чарвякова, Таргонскі). Месячнік беларусізацыі праведзены фармальна. Ячэйка абмежавалася толькі тым, што праверыла наколькі кожны камуніст можа чытаць па беларуску і на гэтым паставіла кропку. Не завострана ўвага на барацьбе супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на данным этапе, контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму і шавінізму інш. колераў.

Бюро Райкому КП(б)Б прыняла рашучыя меры ў адносінах да Лельчыцкай парт'ячэйкі. У часе перавыбораў, парт'ячэйка павінна на грунце самакрытыкі і крытыкі выявіць усе недахопы, якія маюцца ў рабоце ячэйкі і мабілізаваць сваю ўвагу на ўдарнае правядзеньне бальшавіцкай сяўбы.

Коцік.

Салдаценка (заходняя вобласьць) брыгадзір па калектывізацыі і па падрыхтоўцы да сяўбы.

Угора на зьезьдзе калгасаў

◆ Старшыня Калгасцэнтру таварыш Міцькоў закончае свой даклад. Яго зьмяняюць садакладчыкі т. Гутман — аб кадрах і тав. Камаеў—упаўнаважаны Трактарацэнтру.

◆ Разгортваюцца спрэчкі. Яны ўскрываюць усё жыцьцё, балючыя мясьціны кожнага раёну, калгасу.

◆ Выступленьні чарпуюцца з заявам: аб ударніцтве, сацспаборніцтве, залічэньні ў калгас, партыю.

◆ Трыбуна па 10 хвілін затрымлівае калгасьніц, калгасьнікаў. Адзін за адным праходзяць тт. Хведарэнка (Полацкі р-н), Шамяліў (Бабруйскі раён), Яўсеенка (Камарынскі раён), Марголін (Смалявіцкі раён), Шыманская (Барковіцкі раён) і інш.

◆ Кожны апавядае пра набалеўшае, стараецца пасьпець выказаць усё патрэбнае за кароткія хвіліны.

◆ Нам непатрэбна прыгожых слоў, рэзалюцый, а патрэбна работа, работа і яшчэ раз работа,—кажа т. Станкевіч з Клімавіцкага раёну.

◆ Бядняк, які вядзе работу супроць калгасу — наш вораг, — падзяляецца сваімі думкамі тав. Пятроў (Кармянскі раён).

◆ Убачыўшы на справе тую вялікую перавагу, якую мае калектыўная гаспадарка над аднаасобнай, я, Бабін В. з вёскі Пратасевіч, Асіпавіцкага раёну, уступаю ў калгас нашай вёскі і бяру на сябе абавязак перад зьездам, упягваць беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў у калгасы. Заклікаю ўсіх дэлегатаў зьезду аднаасобнікаў пасьледваць майму прыкладу.

◆ Прашу зьезд лічыць мяне з сёньняшняга дню калгасьнікам,—зачытвае старшыня зьезду заяву бедняка Чавускага раёну, Сушкаўскага сельсавету, Сівакова Амяльяна Анісімава.—Абяцаю стаць актыўным барацьбітом за калгасы. Выклікаю ўсіх аднаасобнікаў, прысутных на зьезьдзе, пайсьці па маім шляху.

◆ Я, член першапачатковага таварыства «Ударнік», Сіроцінскага р-ну, Міронаў Акім — бядняк, абяцаю ад гэтага дню весьці ўпартую барацьбу за суцэльную калектывізацыю; прашу лічыць мяне калгасьнікам.

◆ Працяжныя гучныя воплескі.

◆ Ня маем ніводнага трактара пры калектывізаваныі 35,8 проц. гаспадарак раёну, — скардзіцца тав. Купрыянаў (Крычаўскі раён).

◆ «Лапці толькі для калгасьнікаў» —прычэпіл цэтлік у краме спажывец кай каапэрацыі Слуцкага раёну, а кулак робіць перастаноўку па свойму і кажа «калгасьнікам толькі лапці». Вось як няўдала часамі падыходзяць прадаўнікі спажыўкаапэрацыі да агітацыі за калгасы. Ня могуць, як сьлед, нават асартымэнту прамтаварам адабраць для калгасьнікаў,—іронструе сваё выступленьне тав. Грыневіч.

◆ Ад талеркі кампоту ці ад лыжкі мармаляду рабакі ў жываце не завядуцца і для здароўя гэта не пашкодзіць, а між тым пра сады ніхто не памянуў. Сады-ж у нас у паўразваленым становішчы», правільна падмячае тав. Ратусенка.

◆ «Па прыезьдзе дамоў аддам усе сілы на ўцягненьне батракоў і беднаты разам з серадняком у калгас. Прашу ад сёньняшняга дню лічыць мяне калгасьнікам»,—чытае зноў старшыня зьезду заяву Ўладзімера Талокі са Сьвіслацкага раёну.

◆ І далей: «Прашу ад гэтага дню лічыць мяне калгасьнікам і запэўняю III зьезд калгасаў, што вярнуўшыся дамоў прыкладу ўсю сваю старанасьць, каб у сваёй і суседніх вёсках арганізаваць калгасы. Шпакоўскі Янка з пасёлку «Чарвякова», Сьвіслацкага раёну.

◆ Ударнікам другой бальшавіцкай вясны абвяшчае сябе 25-тысячнік Ганчароў Міхась з калгасу «Чырвоны Кастрычнік» і замацоўваецца на працу ў калгасе да канца пяцігодкі, выклікаўшы на гэта-ж усіх 25-тысячнікаў.

◆ У адказ на замах у Японіі на нашага гандлёвага прадстаўніка тав. Анікеева заклікае да пратэсту дэлегат зьезду тав. Лабаноў.

◆ 300 актывістаў камсамольцаў пасылае Пленум ЦК ЛКСМБ на дапамогу веснавой сяўбе, — зазначае таварыш Юр'янц.

◆ 18 год працавала ў кулакоў, зараз упэўнілася, што толькі камуністычная партыя зьяўляецца сапраўдным правадыром і кіраўніком працоўных у іх барацьбе за сацыялізм, а таму падаю заяву аб прыёме мяне ў рады партыі, каб разам змагацца за сацыялістычнае будаўніцтва, — паведамляе тав. Бруй з калгасу «Трактар».

◆ Прашу лічыць мяне калгасьнікам. Абяцаю зьезду ўпягнуць сваю вёску і ўсю акаляючую беднату ў калгасы. Бядняк - аднаасобнік Бэркусоў Алесь Давыдаў з в. Жгуно, Гомельскага раёну.

◆ Абвяшчаю сябе да канца пяцігодкі ўдарнікам на жывёлагадоўлі, абяцаю арганізаваць брыгады жанчын - ударніц па ўсіх галінах працы. Заклікаю ўсіх дэлегатак зьезду пасьледваць майму прыкладу,—піша Соня Шыманская, калгасьніца «Новага Шляху», Барковіцкага раёну.

◆ Нацыянальнае польскае насельніцтва Плешчаніцкага раёну ўжо на 45 проц. увайшло ў калгасы, у той час, як раён калектывізаваны на 35 проц.,—заўважае тав. Акулік.

◆ Паўтаратысячная армія будаўнікоў Менску вітае III зьезд калгасаў праз дэлегацыю ў асобе рабочага тав. Гольдштэйна і інш.

◆ Ад зьезду калгасаў паслана пры вітальная тэлеграма праз ЦСПСБ усёй рабочай клясе БССР.

◆ Рабочы тав. Грот перадае зьезду пчырае прывітаньне ад 2-тысячнай армії швэйнікаў чырвонаштандарнай фабрыкі «Акцябр».

◆ Я бяднячка - калгасьніца «Новага Шляху», Чавускага раёну, Цімашэнка Лукер'я, заяўляю аб сваім жаданьні з дню Ўсебеларускага зьезду калгасаў уступіць у рады камуністычнай партыі.

◆ Ад калгасаў Заходняй вобласьці вітае зьезд тав. Зенковіч.

◆ «Проста злачынна заставацца за раз па-за радоў партыі. Абяцаю быць вытрыманай сталёвай бальшавічкай. Івашкевіч Юлька з калгасу «Колас», Асьвейскага раёну».

◆ Усе калектывізаваныя гаспадаркі Ніжня - Ноўгарадзкай губэрні праз тэлеграму вітаюць III Усебеларускі зьезд калгасаў.

Ермалінская, 18 год служыла пану і толькі за адзін год калгаснага жыцьця ўбачыла сьвет, просіць лічыць і яе ад гэтага часу членам партыі. на абяцае апошнія гады свайго жыцьця аддана працаваць у камуністычнай партыі

◆ Тав. Берасьневіч, аднаасобнік Бабруйскага раёну, просіць лічыць яго калгасьнікам.

◆ Калгасьнік Громаў з калгасу імя Дзяржынскага, Магілеўскага раёну, аб вяшчае сябе ўдарнікам.

◆ Працуючы ў калгасе «Дуброва», Клічаўскага раёну, супольна з барацьбітамі за новае сацыялістычнае жыцьцё — членамі і кандыдатамі нашай партыі, я канчаткова пераканалася ў тым, што ранейшая батрачка, а зараз разьвяволеная калгасьніца - ударніца бязумоўна павінна быць у радох КП(б)Б.

◆ «У адказ на апошняе здарэньне ў Японіі я рашыла ўступіць з гэтага дню ў камуністычную партыю, якая ідзе па шляху Леніна і пась

НА ШТУРМ ДРУГОЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ!

ВЫШЭЙ ТЭМПЫ ПРЫЛІВУ У КАЛГАСЫ

Правільная арганізацыя працы ў калгасе, ударніцтва, спаборніцтва—зарука калгаснай перамогі.

АБ КАЛГАСНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ

Даклад старшыні Калгасцэнтру тав. МІЦЬКОВА на III усебеларускім зьезьдзе калгасаў

Другі зьезд калгасаў адбыўся ў кастрычніку 1928 г. Прайшло толькі два з паловаю гады—тэрмін невялікі, але гэты перыяд ровен цэлай гістарычнай эпосе. Рабочая кляса пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі з посьпехам выканала плян першых двух гадоў пяцігодкі і ўступіла ў 3-ці рашаючы год. З рашаючы год пяцігодкі забясьпечыць завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Выкананьне праграмы першых двух год пяцігодкі ў галіне індустрыялізацыі прынесла нам надзвычайна вялікія посьпехі, якія зьявіліся рашаючымі і ў сацыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі. Да трэцяга году пяцігодкі мы канчаткова ліквідавалі беспрацоўе па ўсім СССР, за гэтыя гады адбыўся карэнны паварот шырокіх бяднацка-серадняцкіх мас на шлях сацыялізму—на шлях калектывізацыі. Бяднацка-серадняцкія масы зразумелі перавагу буйнай калгаснай гаспадаркі над дробнай аднаасобнай і ў выніку яны з кожным днём усё больш і больш становяцца на шлях калектывізацыі.

— Мы практычна прыступілі да выкананьня задачы правядзеньня суцэльнай калектывізацыі і на падставе яе практычна ажыцьцяўляем ліквідацыю кулацтва, як клясы.

За час з другога зьезду калгасаў мы маем вялізарныя посьпехі ў справе калектывізацыі. Пяцігадовы плян мы ня толькі выканалі, але і перавыканалі: па пяцігодцы прадугледжвалася калектывізацыяй ахапіць у 1933 годзе 11 % бяднацка-серадняцкіх гаспадарак, а на 20 сакавіка г. г. 20 проц. усіх бяднацка-серадняцкіх гаспадарак аб'яднаны ў калгасы. Паводле пяцігадовага пляну ў 1933 г. вызначалася мець 4561 калгасаў, а на 10 сакавіка гэтага году іх налічваецца ўжо 5180. Меркавалася да канца пяцігодкі ў калгасы ўцягнуць 79.390 гаспадарак, а паводле апошніх даных у калгасах БССР ёсьць 154.000 бяднацка-серадняцкіх гаспадарак. Замест 756.000 га да канца пяцігодкі, мы зараз маем абагуленых ужо каля 2.000.000 га. Вялізарныя посьпехі ў справе калектывізацыі маюцца ня толькі сярод беларускага сялянства, але і сярод насельніцтва нацыянальных меншасьцяй.

Калгасы Савецкай Беларусі толькі ў выніку складаньня простых сродкаў вытворчасьці ўжо паказалі буйную перавагу калектыўнай вытворчасьці над дробнай аднаасобнай.

Гэтыя перавагі калгасаў заключаюцца ў тым, што, па-першае, ў калгасах значна вышэй прадукцыйнасьць працы і больш эфэктыўна выкарыстоўваюцца сродкі вытворчасьці, чым у індывідуальнай гаспадарцы. Другая перавага заключаецца ў тым, што ўраджайнасьць у калгасе вышэй, чым у аднаасобнай гаспадарках: у аднаасобнай гаспадарцы з 1 га зьбіраецца жыта 7,9 цэнтн., а ў калгасе—8,8 цэнтн. Калі ў аднаасобнай гаспадарцы з 1 га сабрана 8,3 цэнтн. аўса, дык у калгасе—9,4 цэнтн. і г. д. Па-трэцяе, паводле даных абсьледваньня, на апрацоўку 1 га жыта ад пачатку да канца—г. зн. узараць, забарановаць, засеяць, жаць, абмалаціць у аднаасобнай гаспадарцы затрачваецца 38,8 чалавекадзён, а калгас затрачвае толькі 21,9 чалавека-дзён.

Нарэшце перавага буйнай калектыўнай гаспадаркі над дробнай аднаасобнай заключаецца ў тым, што таварнасьць у калгасе значна вышэйшая. Пры ўдзельнай вазе калгасаў у пасеўных плошчах у 15 проц., яны ў хлебазагатоўках маюць звыш 27 проц. Даходнасьць адзіўй калгаснай сям'і толькі ў першым годзе вядзеньня калгасу ў паўтара-два разы вышэй за даходнасьць аднаасобнай гаспадаркі. Сярэдняя валавая даходнасьць на адну сям'ю ў калгасе складае каля 1000 р., а чысты прыбытак—400-500 руб. Такога прыбытку ніводная аднаасобная бяднацка-серадняцкая гаспадарка ня мае.

Перавага калектыўнай вытворчасьці, якую ў сябе каля боку бачыць бядняк з серадняком,—вось тое асноўнае, што паказвае аднаасобніку бедняку і серадняку на шлях калектывізацыі.

Вось што гаворыць самі калгасьнікі аб выніках іх працы ў калгасе. Калгасьнік Судак Іван кажа—«раней я ходзіў па хатах з торбай і зьбіраў хлеб, зараз, працуючы ў калгасе, у мяне хле ба хапае ня толькі для сябе, але і для другіх. Рабіце што хочаце, а я з калгасу ня выйду і аднаасобнікам ня буду». Такіх заяў, што беднякі і сераднякі, прапрацаваўшы год у калгасе, больш ня хочуць быць аднаасобнікамі, мы чуем сотнямі тысяч ад учарайшых аднаасобнікаў, а сёньняшніх калгасьнікаў.

— Мы ў нашай калгаснай сыстэме аб'яднаем ужо сотні тысяч актыўных барацьбітоў за сацыялізм, за новую сацыялістычную сельскую гаспадарку. Калгасы і калгасьнікі праводзяць вялізарную работу па ўцягваньні новых членаў і арганізацыі новых калгасаў.

Рад раёнаў БССР наблізаецца да раёнаў суцэльнай калектывізацыі. Вось гэтыя перадавыя раёны—Клімавіцкі калектывізаваны на 43,6 проц., Лепельскі—на 45,1 проц., Койданаўскі—на 37,8 проц., Жыткавіцкі—на 36,5 проц., Круглянскі—на 34,4 проц., Крычаўскі—на 34,8 проц. і Брагінскі—на 33 проц.

— Практычныя вынікі работы па калектывізацыі разьбілі ўсе працоўныя буржуазіі, правых апартуністаў і контррэвалюцыйных трацкістаў, якія разглядалі мерапрыемствы партыі па калектывізацыі і саўгасным будаўніцтве, як фантазію, як чорт ведае што, а ня як рэальнае мерапрыемства.

Буржуазія прадказвала голад на 1930 г. Яна гаварыла, што ў выніку калектывізацыі мы ня будзем мець здавальняючага ўраджаю, а мы ў 1930 годзе мелі на 75 млн. цэнтн. больш валавой прадукцыі, чымся царская Расія ў самы ўраджайны год.

— Мы можам заявіць усёй буржуазіі, усім правым апартуністам, што з кожным годам мы становімся мацней. Зараз на падставе калектывізацыі нам не страшан і голад, бо неўраджайнасьць страшна тады, калі маем аднаасобныя раздробленыя бяднацка - серадняцкія гаспадаркі, якія ніяк плянаваць немагчыма, на падставе якіх нельга праводзіць мерапрыемствы, накіраваных на належнае падняцьце ўраджайнасьці.

— Вось што мы чулі з боку правых ухілістаў, у прыватнасьці з боку Бухарына, які гаварыў—«совхозы и колхозы дадут необходимое количество хлеба через 5—10 лет, а нам нужно выкручиваться сейчас». Адгэтуль усе, хто яго падтрымлівалі, ставілі стаўку на тое, што калгасы і саўгасы змогуць даць таварны хлеб толькі праз некалькі год, хлеб-жа патрэбен зараз, а таму давайце сябраваць з кулакамі, давайце іх ня крыўдзіць і г. д. Адгэтуль лінія правых апартуністаў на зрыў калгаснага і саўгаснага будаўніцтва.

Усіх посьпехаў мы дамагліся, дзякуючы правільнаму ленінскаму кіраўніцтву кампартыі, дзякуючы рашучай барацьбе з правымі апартуністамі, з контрэвалюцыйнымі нацдэмамі, з прышчэпаўшчынай. Гэтыя посьпехі забясьпечылі нам пасьпяхомае выкананьне задачы індустрыялізацыі краіны.

— Пралетарская дзяржава аказвае вялізарную вытворчую дапамогу сельскай гаспадарцы. Толькі за апошнія 2 гады калгасы БССР атрымалі звыш 60 млн. рублёў. Толькі за апошнія 2 гады трактарны парк вырас у БССР да 1700 трактараў. Сёлета ў нас будзе працаваць 23 МТС. У мінулым годзе трактар у нас скарыстоўваўся з большай выгадай, чым у папярэднія гады, з яшчэ большай выгадай ён працуе ў МТС.

— Побач з вялізарнымі дасягненьнямі мы маем яшчэ шмат недахопаў. Ня гледзячы на тое, што мы маем усё неабходнае для разгортваньня шпаркіх тэмпаў калектывізацыі, сёньняшнія тэмпы зьяўляюцца недастатковымі. Увесну мы павінны мець 30 проц. калектывізаваных бяднацка-серадняцкіх гаспадарак, а зараз мы маем толькі 20 проц.

Зьезд павінен падкрэсьліць з усёй сілай тое, што мы не скарыстоўваем усіх магчымасьцяй, каб справу калектывізацыі рухаць наперад бальшавіцкімі тэмпамі.

Для таго, каб выканаць нашу праграму ў 30 проц. калектывізацыі, неабходна, каб кожную дэкаду ўцягвалася ў калгасы 10.700 гаспадарак, або іншымі словамі, каб кожны калгас кожныя 10 дзён уцягваў ня менш як 2 новых гаспадаркі. Гэта задача ўпаўне рэальна і абсалютна выпаўнімая.

Адстаючым раёнам трэба па-бальшавіцку ўзяцца за пашырэньне калгаснага руху. Асабліва адсталі ў нас Гарадоцкі (8 проц.), Гомельскі (8 проц.), Рэчыцкі—каля 9 проц., Бабруйскі, Сіроцінскі, Межынскі і Віцебскі раёны маюць толькі 10 проц. агульнай колькасьці бяднацка-серадняцкіх гаспадарак, уцягнутых у калгасы. У Гарадоцкім, Ветрынскім, Сіроцінскім, Віцебскім, Уваравіцкім і Гомельскім раёнах за апошні месяц ніводнай гаспадаркі ня ўцягнута ў калгасы. Пры такіх тэмпах кантрольнай лічбы ў 30 проц. ня выканаеш.

Прычыны нездавальняючых тэмпаў заключаюцца ў адсутнасьці работы з боку большасьці райкалгасасоюзаў, недастаткова працаваў і Белкалгасцэнтр. Па шэрагу раёнаў яшчэ існуе апартуністычная стаўка на самацёк і неразуменьне лёзунгу дабраахвотнасьці. На мясцох забываюць, што трэба весьці сыстэматычную штодзённую работу па растлумачэньні бяднацка-серадняцкім масам перавагі калектыўнае гаспадаркі. У шэрагу месц нашы райкалгасасоюзы адстаюць ад тэмпаў, ня ўмеюць стаць на чале ініцыятывы калгасных і бяднацка-серадняцкіх мас, несваячасова афармляюць арганізаваўшыяся калгасы.

Тав. Міцькоў у сваім дакладзе падрабязна спыняецца на той шалёнай кампаніі, якую вядуць супроць калектывізацыі кулакі. Мы вычысьцілі 1500 кулацкіх сямей, але чыстка калгасаў ад кулацкіх элемэнтаў праведзена недастаткова. Кулакі яшчэ засталіся ў калгасах. Мы ў нашай практычнай рабоце недастаткова выкрываем шкодніцкую, контрэвалюцыйную кулацкую дзейнасьць. Недапушчальнае зьявішча і тое, што некаторыя калгасы замыкаюцца ад аднаасобнікаў, пад рознымі прычынамі не жадаюць прымаць новых членаў.

Што трэба зрабіць для таго каб выпаўнаць праграму калектывізацыі ў 30 проц?

Неабходна, каб кожны калгасаюз, кожнае праўленьне калгасу рашуча ўзмацнілі работу па калектывізацыі, па вярбоўцы новых членаў, па арганізацыі новых калгасаў.

Зьезд павінен паставіць практычнай задачай перад кожным калгасам—падвоіць колькасьць членаў калгасу да выхаду ў поле. Мы павінны забясьпечыць, каб кожную дэкаду кожны калгас уцягваць ня менш дзьвюх гаспадарак. Кожны калгас у мэтах узмацненьня тэмпаў калектывізацыі павінен штодзённа накіроўваць людзей, каб яны пад кіраўніцтвам партыйных і савецкіх арганізацый праводзілі масавую агітацыйную работу за пашырэньне калгаснага руху.

Зьезд павінен патрабаваць ад усёй нашай сыстэмы, ад кожнага работніка, каб афармленьне калгасаў, складаньне вытворчых плянаў праводзілася не пазьней як на працягу 10 дзён з моманту арганізацыі калгасу.

Тав. Міцькоў у сваім дакладзе шмат увагі аддае пытаньню арганізацыі калектыўнай вытворчасьці. Асноўным зьявіным гэтага пытаньня зьяўляецца плянаваць, правільная арганізацыя працы, правільнае размеркаваньне да ходаў. Арганізацыя працы павінна бу даваць на падставе дзьвёрдай выдзеленай нормы выработкі. У 1930 годзе норма выработкі была ўведзена толькі ў 31 проц. агульнай колькасьці калгасаў, а зьдзельшчына ўсяго ў 9,8 проц. калгасаў. Недахопу рабочай сілы ў колгасах у нас няма, а ёсьць няправільная, няўмелая расстаноўка людзей і няправільнае іх скарыстаньне. Калі толькі ў калгасе пераходзяць на цьвёрдыя нормы выработкі і на зьдзельшчыну, дык там хапала і рабочых рук і падымалася вытворчасьць.

Трэба неадкладна перайсьці на брыгадны мэтад работы, трэба абавязкова перайсьці на цьвёрдыя нормы выпрацоўкі, улічваць работу па колькасьці і па якасьці.

Калгасная гаспадарка, як буйная сацыялістычная гаспадарка павінна быць і высока таварнай гаспадаркай. Калгасы павінны ператварыцца ў фабрыкі мяса, малака, тэхнічных культур, гародніны, садовіны і г. д. Гэтага можна дасягнуць толькі на падставе спэцыялізацыі кожнага калгасу.

Мы ўжо спэцыялізаваліся па лініі малочных таварных фэрмаў. Калгасы —ў мінулым годзе прадалі дзяржаве каля 10 млн. літраў малака, 7.700 таварных сьвіньней. За першы квартал гэтага году калгасы здалі каля 2.000 сьвіньней, аднак, якасныя паказчыкі працы вельмі нізкія, яшчэ надзвычайна нізкая таварнасьць нашых калгасаў у параўнаньні з тым, што яны могуць і павінны мець.

Мы назіраем такія зьявішчы, што для догляду за сьвіньнямі ў калгасах пасылаюць самых адсталых калгаснікаў, якія з даручанай справай не спраўляюцца і ня могуць спраўвіцца. У выніку сьвінагадоўлі—адна з найвыгоднейшых галін гаспадаркі ў шэрагу месц зьяўляецца ў заняпадзе. На мясцох скардзяцца, што нехапае кармоў для жывёлы, а калі праверылі, дык выявілася, што сена, салома валяецца пад нагамі, што бульбы хапае, але да гэтай справы адносяцца бесгаспадарча. Усю нашу ўвагу трэба вызярнуць на тое, каб па гаспадарку скарыстаць маючыяся рэсурсы кармоў.

У галіне жывёлагадоўлі перад намі стаіць задача паставіць у спэцыяльзаваных калгасах 150.000 сьвінаматак і забясьпечыць выхад таварнай прадукцыі ў 180.000 адкормленых сьвіней. У спэцыялізаваных малочных фэрмах трэба паставіць ня менш 78.000 малочных кароў і забясьпечыць выхад ня менш 46.000 тон малака. Неабходна правесьці вялікія мерапрыемствы і па лініі дробнай жывёлагадоўлі, разгортваньня трусагадоўлі, птушніцтва і г. д.

Трэба рашуча змагацца за падвышэньне таварнасьці нашых калгасаў і абвясьціць бязьлітасную вайну бесгаспадарчасьці і расьцільдзяйству.

У вырашэньні кармовай базы вялікае месца займае і павінна заняць сіласаваньне. Летась мы гэтую справу праваліл таму, што не змаглі арганізаваць калгасную масу на выкананьне плянаў сіласаваньня.. З матарыялу, якія мы маем, відаць, што тая маса сілосу, якую мы зазалжылі летась у асноўным у добрым становішчы і кармы атрымліваюцца добрыя. Наша задача выкарыстаць гэтую практыку і шырэй яе распаўсюдзіць. Трэба ў бліжэйшыя дні давесьці да кожнага калгасу і калгасьніка плян сіласаваньня каб яны ведалі, што трэба рабіць і што сеяць для сілосу. Наша ўстаноўка ў сіласаваньні павінна заключацца галоўным чынам на ямах і траншэях, бо гэта будзе таньней, а па-другое, для будаўніцтва мураваных і драўляных вежаў ня хопіць матарыялу.

Мы пакуль што далёка недастаткова змагаемся за павялічэньне ўраджаю. З апошніх зводак відаць, што ачыстка насеньня пасоўваецца ўперад вельмі марудным тэмпамі, штучнае ўгнаеньне не забіраецца са складаў, бо спадзяюцца на тое, што яшчэ пасьпеем. Трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на скарыстаньне тарфянога ўгнаеньня, якое дае вялікі эфэкт у падвышэньні ўраджайнасьці, а між тым калгасы гэтым пытаньнем займаюцца недастаткова. Мы сёлета павінны забясьпечыць ня менш 30.000 тон торфу для подсьцілу і 800.000 тон на ўгнаеньне

У справе ўздыму ўраджайнасьці вялікае значэньне мае кантрактацыя. У мінулым годзе мы з кантрактацыяй праспалі, ды і сёлета яна праводзіцца пакуль вельмі слаба. Яшчэ ніводны раён ня выканаў пляну кантрактацыі. Трэба ў бліжэйшы час гэтую работу абавязкова скончыць.

Трэба з такой апартуністычнай недаацэнкай насеньнаводніцтва рашуча скончыць і ўзяцца па-баявому за вырашэньне гэтай праблемы.

Сёлета мы павінны засеяць пад тэхнічнымі культурамі ня менш 100.000 га, з іх 85.000 пад лёнам. Гэтае заданьне мы павінны выканаць.

Кепска стаіць справа з пераапрацоўкай лёну. Вінаваты тут мы—кіруючыя органы, бо мы не арганізавалі на гэту справу своячасова калгасьнікаў. Там, дзе людзі былі арганізаваны, дзе была правільна арганізавана работа, там і лён пераапрацаваны. Дзяржава пашырае будаўніцтва лёнаапрацоўчых заводаў, але гэтага яшчэ мала, каб захапіць увесь лён. Трэба разьлічваць на ўласныя сілы ў пераапрацоўцы. Трэба правільна размеркаваць працу і ўстанавіць правільную зьдзельную аплату за апрацоўку лёну.

Далёка нездавальняючымі тэмпамі мы рыхтуемся да вясны ў гарадох гаспадарках. Людзі чакаюць, што ім усё да ставяць, усё прывязуць ледзь ня гной для заклад парнікоў. Калгасы павінны не марудзіць з гэтай справай і па ўдарнаму ўзяцца за справу, каб забясьпечыць рабочых гарадоў гароднінай і іншымі прадуктамі сельскай гаспадаркі.

Чарговае пытаньне, на якім спыняецца тав. Міцькоў—гэта машынізацыя сельскай гаспадаркі. Трэба рацыянальна скарыстоўваць усе машыны і у першую чаргу трактары. Увесну ў БССР будзе працаваць у 23 раёнах МТС, мы разгортваем будаўніцтва яшчэ 3-х машынна трактарных станцый. Неабходна пытаньне будаўніцтва МТС увязаць з мабілізацыяй сродкаў. У нас мабілізацыя сродкаў на будаўніцтва МТС ідзе нездавальняльна марудна не таму, што няма гропай, а таму што ня ўмеем, або ня хочам арганізаваць працу. Трэба ўзяцца за неадкладнае і поўнае выкананьне пляну па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру.

Коні, як цягавая сіла, адыгрывалі і будуць адыгрываць у нашай гаспадарцы вялікую ролю. Неабходна на гэты від нашае гаспадаркі зьвярнуць сур'ёзную ўвагу і імкнуцца да павялічэньня колькасьці коняй у колгасах.

Чаму ў калгасах назіраецца нэправільнае разьмеркаваньне прыбытку і ўраджаю,—ставіць пытаньне тав. Міцькоў і адказвае:

— Прычына хаваецца ў дрэнным кіраўніцтве Ні калгасцэнтр, ні райкалгасасоюзы не перабудавалі сваёй працы ў адпаведнасьці з задачамі, якія перад намі стаяць. Калгасная сыстэма да арганізацыі райкалгасасоюзаў не займалася пытаньнямі вытворчасьці. Наша асноўная задача—гэта арганізацыя вытворчасьці ў калгасах, ведаць гэтую вытворчасьць.

У заключэньне свайго дакладу тав. Міцькоў спыняецца на пытаньні аб кадрах. На мясцох у райкалгасасоюзах не зварочваюць належнай увагі на вылучэньне, на падрыхтоўку кадраў, асабліва з ліку жанчын. Трэба лепшых актывістаў калгасьнікаў і калгасьніц высоўваць на адказную працу як у раёны, так і ў Белкалгасцэнтр.

Мы павінны сёлета падрыхтаваць праз каротка-тэрміновыя курсы 17.000 калгасьнікаў, каб яны змаглі лепш паставіць справу ў сваіх калгасах. Пакуль што падрыхтоўка ідзе марудным тэмпамі,—падрыхтавана каля 7.000 чалавек, трэба ўдарыць па недаацэнцы ў падрыхтоўцы калгасных кадраў.

— Я прасіў-бы вас, кажа тав. Міцькоў, каб вы ў спрэчках, дапамаглі нам высьветліць усе недахопы ў справе калгаснага будаўніцтва, у справе арганізацыі працы, у справе разьмеркаваньня ўраджаю і даходаў, дапамаглі-б нам высьветліць усе спрыжнёвыя пытаньні ўзмацненьня тэмпаў калектывізацыі і падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны.

Белым і ткамі шыта

Паводле паведамленьня польскіх газэт, 9 красавіка ў варшаўскім акруговым судзе павінен адбыцца працэс Палянскага — аднаго з арганізатараў замаху на ўзрыў савецкага паўнамоцнага прадстаўніцтва ў Варшаве ў красавіку месяцы мінулага году.

Працэс Палянскага будзе трэцім па парадку працэсам антысавецкіх тэрарыстаў, абраўшых замах на жыцьцё савецкіх прадстаўнікоў у Польшчы ў якасьці асноўнага спосабу правакаваньня канфлікту паміж СССР і Польшчай. Тэрор супроць савецкіх прадстаўнікоў у Польшчы пачаў ужывацца іменна ў той момант, калі ў сувязі з прыходам да ўлады кіруючага зараз лягеру пілсудчыкаў рэзка ўзмацнілася антысавецкая ўстаноўка замежнай палітыкі Польшчы. Актывізацыя варожых СССР колаў у Польшчы, ня супынныя антысавецкія кампаніі ў прэсе, якія справаджаюцца гнусным цкаваньнем савецкага дыпляматычнага прадстаўніцтва, стварылі тыя насычаныя антысавецкім шалёнствам палітычныя абставіны, якія разьвязалі рукі Кавярдзе і Вайцяхоўскаму, арганізатарам замаху на ўзрыў паўнамоцнага прадстаўніцтва і тым, якія стаялі за іх сьпіной.

Сёлета мы павінны засеяць пад тэхнічнымі культурамі ня менш 100.000 га, з іх 85.000 пад лёнам. Гэтае заданьне мы павінны выканаць.

Кепска стаіць справа з пераапрацоўкай лёну. Вінаваты тут мы—кіруючыя органы, бо мы не арганізавалі на гэту справу своячасова калгасьнікаў. Там, дзе людзі былі арганізаваны, дзе была правільна арганізавана работа, там і лён пераапрацаваны. Дзяржава пашырае будаўніцтва лёнаапрацоўчых заводаў, але гэтага яшчэ мала, каб захапіць увесь лён. Трэба разьлічваць на ўласныя сілы ў пераапрацоўцы. Трэба правільна размеркаваць працу і ўстанавіць правільную зьдзельную аплату за апрацоўку лёну.

Далёка нездавальняючымі тэмпамі мы рыхтуемся да вясны ў гарадох гаспадарках. Людзі чакаюць, што ім усё да ставяць, усё прывязуць ледзь ня гной для заклад парнікоў. Калгасы павінны не марудзіць з гэтай справай і па ўдарнаму ўзяцца за справу, каб забясьпечыць рабочых гарадоў гароднінай і іншымі прадуктамі сельскай гаспадаркі.

Чарговае пытаньне, на якім спыняецца тав. Міцькоў—гэта машынізацыя сельскай гаспадаркі. Трэба рацыянальна скарыстоўваць усе машыны і у першую чаргу трактары. Увесну ў БССР будзе працаваць у 23 раёнах МТС, мы разгортваем будаўніцтва яшчэ 3-х машынна трактарных станцый. Неабходна пытаньне будаўніцтва МТС увязаць з мабілізацыяй сродкаў. У нас мабілізацыя сродкаў на будаўніцтва МТС ідзе нездавальняльна марудна не таму, што няма гропай, а таму што ня ўмеем, або ня хочам арганізаваць працу. Трэба ўзяцца за неадкладнае і поўнае выкананьне пляну па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру.

Коні, як цягавая сіла, адыгрываліі будуць адыгрываць у нашай гаспадарцы вялікую ролю. Неабходна на гэты від нашае гаспадаркі зьвярнуць сур'ёзную ўвагу і імкнуцца да павялічэньня колькасьці коняй у колгасах.

Чаму ў калгасах назіраецца нэправільнае разьмеркаваньне прыбытку і ўраджаю,—ставіць пытаньне тав. Міцькоў і адказвае:

— Прычына хаваецца ў дрэнным кіраўніцтве Ні калгасцэнтр, ні райкалгасасоюзы не перабудавалі сваёй працы ў адпаведнасьці з задачамі, якія перад намі стаяць. Калгасная сыстэма да арганізацыі райкалгасасоюзаў не займалася пытаньнямі вытворчасьці. Наша асноўная задача—гэта арганізацыя вытворчасьці ў калгасах, ведаць гэтую вытворчасьць.

У заключэньне свайго дакладу тав. Міцькоў спыняецца на пытаньні аб кадрах. На мясцох у райкалгасасоюзах не зварочваюць належнай увагі на вылучэньне, на падрыхтоўку кадраў, асабліва з ліку жанчын. Трэба лепшых актывістаў калгасьнікаў і калгасьніц высоўваць на адказную працу як у раёны, так і ў Белкалгасцэнтр.

Мы павінны сёлета падрыхтаваць праз каротка-тэрміновыя курсы 17.000 калгасьнікаў, каб яны змаглі лепш паставіць справу ў сваіх калгасах. Пакуль што падрыхтоўка ідзе марудным тэмпамі,—падрыхтавана каля 7.000 чалавек, трэба ўдарыць па недаацэнцы ў падрыхтоўцы калгасных кадраў.

— Я прасіў-бы вас, кажа тав. Міцькоў, каб вы ў спрэчках, дапамаглі нам высьветліць усе недахопы ў справе калгаснага будаўніцтва, у справе арганізацыі працы, у справе разьмеркаваньня ўраджаю і даходаў, дапамаглі-б нам высьветліць усе спрыжнёвыя пытаньні ўзмацненьня тэмпаў калектывізацыі і падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны.

Міжнародная хроніка

⊙ **У пачатку ўчарайшага паседжаньня нямецкага рэйстагу комдэпутат т. Мадалена патрабаваў ад імя комфракцыі, каб першым пунктам абвесткі дню было пастаўлена на абгаварэньне патрабаваньне аб адмене забароны дэманстрацый і аб адмене забароны Гамбургскага органа компартыі «Гамбургер фольксцэйтунг».**

Калі, матывуючы гэтае патрабаваньне, тав. Мадалена абвінавацаў буржуазны і сац.-дэмакратычны друк у няшчырасьці, старшыня рэйстагу, сац.-дэмакрат Лебе, пазбавіў яго слова, заявіўшы, што «словы Мадалена зьневажаюць друк».

Комфракцыя адказала на гэты чарговы акт рэпрэсіі супроць камуністаў з боку Лебе бурнымі выкрыкамі абурэньня.

Потым рэйхстаг заняўся бюджэтам міністэрства поштаў і тэлеграфаў. Ком дэпутат тав. Торглер выступіў з пратэстам супроць прадугледжанага бюджэтам зьніжэньня зарплаты дзесяткам тысяч дробных паштова-тэлеграфных служачых. Бюджэт быў зацьверджан супроць галасоў компартыі.

Сац.-дэмакратычная фракцыя на сваім паседжаньні, якое адбылося 18 сакавіка, зрабіла: паведамленьне «сац.-дэмакратычная фракцыя рэйхстагу заслухала паведамленьне аб перагаворах з урадам. Пасьля вычарпальнай дыскусіі фракцыя, улічваючы агульнае палітычнае палажэньне, пастанавіла пры галасаваньні пытаньня аб асыгнаваньнях на пабудову броненосца «Б» устрымацца ад галасаваньня».

Пастанова фракцыі бязумоўна выкліча вялізарнае абурэньне сярод радавых членаў партыі і яшчэ больш узмоціць існуючыя ў партыі спрэчкі і бражэньні.

ВЕСТКІ З „РАЮ“

„Ну, дый сьмеху было!“

— Так што дазвольце далажыць, пане начальнік... Студыёзаў разагналі...

І бравы служака — паліцыянт выцягнуўся, чакаючы запытаньняў начальства.

Сыты мопсавы твар начальства—вочы канапліні, а вусы «гвоздем»—засьвяціўся як вычышчаная грыўня:

— «Тэ-э-ёкс... Ахвяры ёсьць?

— Так точна, ёсьць, але... але....

Вусы служакі задрыжэлі ад сьмеху.

— Вінават... Дазвольце адсьмяяцца...

Паліцыянт фыркнуў у рукаў і закалацішся ад няспрыманага жарабячага рогату...

— Даволі!—рэзка спыніў начальнік...—Чакаю дакладу».

Твар служакі прыняў становішча—«сьмірна».

— Так-што ахвяр асоб з дзесяць а можа торшку больш... лётка параненых... Дваім па воку выбілі, аднаму на ту зламалі, аднаму «кумпал» прабілі, аднаму трошку кішкі выпусьцілі, аднаму...

— Ерар-рунда... Др-р-робязь.—пратрымела начальства і потым спыталася:

— Ну-с, а наш новы мэтад?

Сударагі сьмеху зноў прабеглі па бурым твары паліцыянта і ён адрапартаваў:

— Апраўдаў сябе поўнасьцю!

— А падрабязнасьці?

І паліцыянт, стрымліваючы сьмех, дакладваў:

— Так-што гумовыя кі, проста палкі, нават шаблі і сьвінцовыя цукеркі зрабілі толькі палову справы... Вы— вынаходца, пане начальнік!.. Студыёзы, ня гледзячы на страты, мацна тры маліся на вуліцы Мы даві залп і ўрэзаліся ў натоўп. У гэты час па вашаму загаду былі пушчаны.... сьлёзагонныя газы.:: Малюнак атрымаўся сапраўды цікавы: студэнт з выбітым вокам качаецца па бруку і раве бялугай, а над ім працуе тумовым кіем жандар Дзьмухоўскі... Б'е і .. плача, б'е і...

Служака зноў закалаціўся ад сьмеху, заразіўшы на гэты раз і вычышчаную грыўню начальства...

— Гляжу, непадалёку пан Вайніловіч лупіць студыёза са зломанай нагой і сам... плача... А там увесь у крыві, ледзь жывы, ляжыць студэнт з разьбітай галавою, а над ім...

— Ну, дый сьмеху было, пане начальнік.

...На другі дзень рыская газэта расійскіх белагвардзейцаў «Сегодня» пісала:

«Крупные студенческие анти-правительственные демонстрации в Варшаве».

«Полиция пустила в ход слезоточивые газы, от действия которых сама плакала».

«ЛТА. Варшава, 9 марта. ...Полиция для разгона студентов пустила в ход слезоточивые газы... газеты сообщают, что это первый случай применения слезоточивых газов на улицах Варшавы. От действия газов плакали все: студенты, прохожие и... сами полицейские. Общий плач вызвал веселое настроение... Во время столкновения около 10 студентов получили ранения» газ. «Сегодня», № 69)».

«Около 10 раненых—гэта-ж «семечки! Для общего веселого настроения»! Ну-што гэта значыць у параўнаньні з тым эфэктам, які даюць сьлёзагонныя газы разам з іншай... крывятачывай зброяй?!

Вясёлыя людзі ў Варшаве!

Не «краіна—а «рай»!..

200.000 прывітальных лістоў штодзень

Неабмежаваны самаўладда гэтай «вясёлай» дзяржавы маршал Пілсудскі зараз у адпачынку на востраве Мадэры. Лечыцца. Цяжка сказаць пра стан яго здароўя. Ходзяць усякія гутаркі...

Гэтымі днямі маршал і яго «верноподанные» сьвяткавалі імяніны самаўладцы Польшчы. Вось водгукі друку:

«С франко-испанской границы сообщают, что почта там уже несколько дней принимает чрезвычайные меры, чтобы справиться с громадным количеством почтовых мешков с открытками, идущими из Польши. 13 марта международный экспресс Париж—Мадрид задержался на пограничной станции Ирун на целый час из-за необходимости прицепить второй почтовый вагон для перевозки почты Пилсудскому. Согласно телеграммам Пат'а ад 17 с. м. из Фунчале на Мадере туда ежедневно, в течение последних дней, приходит от 100 да 200 тысяч открыток. Почтовое отделение в Фунчале наняло несколько новых служащих, которые заняты исключительно «почтой маршала Пилсудского» (газ. «За свободу», № 75). 200.000 прывітальных лістоў у дзень! Так любіць маршала!

Але ва ўсякім мэдалю ёсьць і адваротны бок. Тая-ж белагвардзейская газэта піша:

«Запрос оппозиции о поздравительных открытках маршалу Пилсудскому. Все оппозиционные партии, как правые, так и левые, внесли 13-го марта в Сейм срочный запрос по делу о моральном давлении на учителей и детей, чтобы они высылали на о. Мадеру поздравительные открытки, по случаю именин маршала Пилсудского. В запросе указывается, что моральное принуждение переходит иногда в прямое злоупотребление учителями своей властью. Запрос заканчивается обращением к правительству относительно того, какие меры им приняты, чтобы подобные случаи не повторялись. Внесшие запросы обосновали его сообщением о нанесении учителем Фрончковским побоев двум детям учащимся в начальной школе в Залесье». (газ. «За свободу», № 71).

Маршала вітаюць «са сьлязьмі на вачох» тысячы вучняў...

Во, калі-б яшчэ сюды ды трошку сьлёзагонных газаў. Па моры «прыязнательных» сьлёз, на лёгкім катары паплыў-бы хворы маршал у Палестыну на пакланеньне сьвятым мясцом, куды ён трымае свой шлях, згодна паведамленьня газэт, пасьля лячэньня на Мадэры...

«Сьлёзы радасьці», «сьмех праз сьлёзы», «любоў і... проста рай у гэтай шчасьлівай Аркадыі....

...І „чаромуха“!..

— Вайна ня скончана... Мы сядзім у акопах...

Так сказаў на днях суровы «цар Антон»—генэрал Дзянікін на ўрачыстым сходзе белагвардзейцаў у Парыжы.

Капіталістычны сьвет—окопы для расійскіх белагвардзейцаў, варожыя акопы ў вайне супроць краіны саветаў. З гэтых акопаў выходзяць Кавярды, Яны Палянскія і іншая белагвардзейская і фашыцкая сволач. Гэтыя «акопныя людзі» гэтыя бульдогі, мопсы і шаўкі, выкінутыя з цёплых населяных месц, пазбаўленыя мякіх пухавікоў,—мараць.

«Настанет день, Россия позовет нас и скажет:—В малом был ты мне верен, над многим тебя поставлю. Тех же, кто в наши трудные дни сторонится от русского дела, Россия не простит—им места на освобожденной родине не будет»...

«На очереди становится вопрос о выработке конкретного отношения к положению в России и задачам освободительной войны». (газ. «За свободу», № 75).

Вурчаць ланцужныя сабакі ў фашыцкіх акопах супроць СССР:

— Хр-р-р. Кр-р-рыві.

Мацёрыя шаўкі сумна вынюць на месяц пра... чаромуху, вялікодныя яйкі, пра... Марфу і Марыю:

«Корни черемухи—любовь, чувство красоты, жажда одухотворенности, а от этих корней цветет в жизни настоящая жизненная «черемуха» (газ. «За свободу»).

Гэта—там, у іх, дзе «чаромуха» сьлёз і крыві на вуліцах Варшавы выклікае вясёлы сьмех?!.

Паўзвар'яцелыя мопсы і шаўкі манапалізавалі любоў і не дазваляюць нам—«рабам» любіць:

«Рабы не смеют любить, они должны только размножаться» (газ. «За свободу»).

Любецеся сабе колькі ўлезе і можаце не размнажацца... Толькі... лапы свае падалеі ад нас...

Дык куды там—«на очереди... задачы освободительной борьбы»

Аб саўгасным будаўніцтве

Пастанова VI зьезду саветаў СССР па дакладу Наркамзему СССР, Зернятрэсту і жывёлагадоўчых саўгасных трэстаў

Заслухаўшы даклад Наркамзему Саюзу ССР і садаклады Зернятрэсту і жывёлагадоўчых саўгасных трэстаў аб саўгасным будаўніцтве, VI зьезд саветаў Саюзу ССР пастанаўляе:

Вынікі саўгаснага будаўніцтва

1. Пачынаючы з 1928 г. разьвіцьцё зярнёвых саўгасаў у нашай краіне ідзе ў непарыўна нарастаючых тэмпах: пасеўная плошча ўсіх зярнёвых культур у саўгасах, як старых, так і новых, па Саюзе ССР складала ў 1928 г. 1,0 млн. гект., у 1929 г.—1,5 млн. гект., у 1930 г—3,9 млн. гект.

2. У дадатак да зярнёвых саўгасаў, якія разьвіліся за гэтыя гады бурнымі тэмпамі, далучаецца, пачынаючы з 1930 г., магутная сетка жывёлагадоўчых саўгасаў, якія арганізуюцца ў тэмпах, перавышаючых будаўніцтва зерносаўгасаў. За 1930 г. ствараюцца: «Скатавод» з 140 саўгасамі, з зямельнай плошчай у 20 млн. гект., са статкам у 1,2 млн. галоў; «Сьвінавод» з 350 саўгасамі, з зямельнай плошчай у 1,2 млн. гект., са статкам у 218 тыс. галоў; «Аўцавод» з 115 саўгасамі, з зямельнай плошчай у 13 млн. гект. і са статкам у 2,7 млн. галоў; «Маслатрэст» з 52 саўгасаў, з зямельнай плошчаю у 1,3 млн. гект., са статкам у 50 тыс. галоў, а таксама шырокая сетка рэспубліканскіх жывёлагадоўчых саўгасаў (конягадоўчых, птушкавых, малочных). У дадатак да ўжо існуючай магутнай сеткі саўгасаў «Саюзсахар» прыступлена да разгортвання саўгасаў тэхнічных культур; трэст ільняных саўгасаў з 56 саўгасамі, з пасеўнай плошчаю ў 8 тыс. гект. лёну і канапель; трэст бавоўняных саўгасаў з 16 саўгасамі, з пасеўнай плошчаю ў 45 тыс. гект. паліўной бавоўны.

Усе саўгасы ўжо ў 1930 г. здалі дзяржаве таварнай прадукцыі на суму больш 200 млн. руб. (у тым ліку 72 млн. пуд зерня, звыш мільёна пудоў мяса, 180 млн. пудоў буракоў, 670 тыс. пуд. бавоўна-валакна).

3. Будаўніцтва саўгасаў адбывалася ва ўмовах жорсткага супраціўленьня кулакоў палітыцы савецкай улады. Ад люстраваньнем гэтага супраціўленьня ў партыі была барацьба правых ухілістаў супроць генэральнай лініі партыі, супроць наступленьня на кулака, супроць разьвіцьця саўгасаў. Правыя ўхілісты ўсіме сіламі спрабавалі затрымаць разьвіцьцё саўгасаў, затарма віць і сарваць наступленьне рабочае класы, беднякоў і сераднякоў на кулака.

Толькі дзякуючы незамірнай барацьбе камуністычнай партыі з правааппартыстычнымі групоўкамі ўдалося адстаяць справу саўгасаў, зламаць супраціўленьне кулакоў і падрыхтаваць глебу для ліквідацыі кулацтва як класы.

II. Значэньне саўгасаў для сялянства

Саўгасы з новай перадавой тэхнікай, ня́бачанымі ў гісторыі чалавецтва разьмерамі гаспадарак (пасеў у саўгасе «Зернятрэсту» складае ад 20 тыс. да 100 тыс. гект. на гаспадарку, разьмер пагалоўя «Скатаводу» ад 5 да 30 тыс. галоў, «Аўцаводу»—ад 50 да 150 тыс. галоў, «Сьвінаводу»—ад 800 да 1,5 тыс. сьвіноматак), з сацыялістычнымі формамі арганізацыі працы паказваюць сялянам перавагі буйнай гаспадаркі і зьяўляюцца вядучай сілай, якая палягае паварот сялян на шлях калектывізацыі.

Саўгасы такім чынам зьяўляюцца ня толькі дзяржаўнымі фабрыкамі с.-г. прадуктаў. Яны зьяўляюцца:

а) крыніцамі непасрэднай дапамогі калгасам (у 1930 г. адны толькі зерна саўгасы ўзарылі калгаснікам, беднякам серадняком-алмазасобнікам 800 тыс. гект., прабаранавалі 700 тыс. гект., усі мі саўгасамі падрыхтаваны сотні тысяч работнікаў для калгасаў);

б) узорам буйнай гаспадаркі, на аснове якой селянін праверае выгадасьць пераходу да буйнага грамадзкага земляробства ня толькі ў галіне зярнёвых культур, але і ў галіне жывёлагадоўлі і тэхнічных культур;

в) школай новай тэхнікі, рассаднікам усялякіх удасканаленьняў і палепшаньняў, якія, будучы праверанымі ў саўгасах, затым ужываюцца шырокай масай калгаснікаў.

Зьезд падкрэсьлівае значэньне саўгасаў у калектывізацыі, паколькі толькі адначасовае разьвіцьцё саўгасаў і калгасаў на аснове ўзрастаючай сацыялістычнай індустрыі забясьпечвае завяршэньне ў асноўным у сучасную пяцігодку калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Адначасова зьезд адзначае вялікую розьніцу паміж саўгасамі калгасамі на данай стадыі разьвіцьця. Саўгасы зьяўляюцца дзяржаўным прадпрыемствамі, дзе дзяржава зьяўляецца поўным гаспадаром, з усімі выцякаючымі адгэтуль вынікамі, і нічым з гэтага пункту гледжаньня не адрозьніваюцца ад любой другой сацыялістычнай фабрыкі прамысловага тыпу. Калгасы-ж, наадварот, зьяўляюцца прадпрыемствамі, заснаванымі сялянамі, якія дабраахвотна абагулілі свае сродкі вытворчасьці і вядуць сваю гаспадарку на зямлі, што належыць дзяржаве. Пры тым гаспадарам калгасу зьяўляюцца калгаснікі, якім рабоча-сялянская дзяржава аказвае ўсялякае падтрыманьне, адводзячы ім лепшыя землі, даючы значныя ільготы і ствараючы для іх праз дзяржаўныя машына-трактарныя станцыі магутную тэхнічную базу.

Таму ўсякага роду спробы ўтоесамляць саўгасы і калгасы, стараць скорасьпелыя саўгасна-калгасныя камбінаты, а тым больш падпарадкаваць калгасы саўгасам зьезд разглядае як грубейшае парушэньне палітыкі савецкай улады.

Дапамога саўгасам, калгасам, дагаворы аб узаемнай дапамозе саўгасаў і калгасаў, практыкуемыя ў многіх раёнах, ня маюць нічога супольнага з антыпеляінскімі спробамі падпарадкаваньня калгасаў саўгасам. Гэта дапамога калгасам, якая будуецца на аснове дагавораў аб узаемнай дапамозе, па вінна ў далейшым прыняць яшчэ больш шырокія разьмеры ня толькі па зярнёвых саўгасах, але і па жывёлагадоўчых саўгасах, разьвіцьцё статку якіх адкрывае вялізарныя магчымасьці хутчэйшага палепшаньня пароды калгаснага статку.

III. Галоўнейшыя недахопы ў рабоце саўгасаў

Зьезд зьвяртае ўвагу ўсіх арганізацый і ў асаблівасьці ўсіх работнікаў саўгасаў на наяўнасьць у рабоце саўгасаў раду буйнейшых недахопаў.

Галоўнейшым недахопам у зярнёвых саўгасах, асабліва недапушчальным у гаспадарках, якія забясьпечваюцца лепшымі сродкамі вытворчасьці, зьяўляецца несвачасовая і дрэнная з-за кепскага скарыстаньня машын уборка ўраджаю, што ў некаторых саўгасах павяло да вялікіх страт зерня і да невыкананьня вытворчай праграмы па здачы дзяржаве таварнай прадукцыі.

Галоўнейшымі недахопамі жывёлагадоўчых саўгасаў зьяўляецца дрэнны дагляд за жывёлай, зусім недастатковае вэтэрынарнае абслугоўваньне, нерацыянальнае скарыстаньне кармоў, што ў некаторых саўгасах прывяло да пагібелі значнай часткі маладняка і зрыву вытворчых заданьняў.

У гэткай-жа меры нешкарпымі зьезд лічыць шматлікія факты злачынна-нядбайных адносін да трактараў і сельска-гаспадарчых машын з боку работнікаў саўгасаў і машына-трактарных станцый.

У адпаведнасьці з гэтым VI зьезд саветаў Саюзу ССР прапануе паставіць у цэнтры далейшай работы на разгортваньні саўгасаў, побач з задачамі колькаснага разгортваньня саўгасаў (рост пасеўных плошчаў і пагалоўя статку ў намечаных плянамі разьмерах), задачы палепшаньня якасьці работы саўгасаў, у асаблівасьці—падвышэньня ўраджайнасьці падвышэньня прадукцыйнасьці статку, падвышэньня ўдоеў, зьніжэньня сабекошту, падвышэньня прадукцыйнасьці працы і пераходу на зьдзельшчыну па ўсіх асноўных работах, рэкага зьмяншэньня страт пры ўборцы, захаваньня маладняка і г. д.

У радзе гэтых задач зьезд падкрэсьлівае:

1. Неабходнасьць барацьбы за сапраўды беражлівыя адносіны да машын. Зьезд адабрае пастанову Цэнтральнага выканаўчага камітэту і Савету народных камісараў Саюзу ССР ад 13 лютага 1931 г. аб крымінальнай адказнасьці за паламаньне і псаваньне трактараў і сельскагаспадарчых машын у выпадках, калі яна выкліканецца нядбайнымі адносінамі да гэтай маемасьці.

2. Неабходнасьць устанаўленьня ў рабоце саўгасаў самага строгага вучоту і кантролю за сапраўдным выкананьнем плянаў вытворчасьці таварнай прадукцыі і здачы яе дзяржаве ў вызначаныя тэрміны.

Поўнае і своячасовае выкананьне пляну вытворчасьці і здачы таварнай прадукцыі робіцца рашаючым паказьнікам практычнай работы саўгасаў, на аснове якога савецкая ўлада будзе ацэньваць работу ўсяго складу работнікаў і ў асаблівасьці дырэктара кожнага саўгасу.

IV. Заданьні па разьвіцьцю саўгасаў

1. У непаслабляючых тэмпах прадоўжваць разьвіцьцё савецкіх гаспадарак, а менавіта:

а) давесьці плошчу пасеву ў савецкіх гаспадарках у 1931 г. да 9,5 мільёнаў гектараў, у тым ліку па Зернятрэсту—5 мільёнаў гектараў, па жывёлагадоўчых трэстах—2 мільёны гектараў, Саюзцукры—930 тысяч гектараў, па тэхнічных культурах (апроч буракоў)—350 тысяч гектараў, па Саюзнасеннаводу — 500 тыс. гектараў;

б) давесьці плошчу пасеву ў савецкіх гаспадарках у 1932 г. да 14 мільёнаў гектараў, у тым ліку па Зернятрэсту—7,2 мільёны гектараў, па жывёлагадоўчых трэстах—4 мільёны гектараў, па Саюзцукры—1 мільён гектараў, тэхнічных культурах (апроч буракоў)—700 тысяч гектараў, па Саюзнасеннаводу—700 тыс. гектараў;

в) давесьці плошчу пасеву ў савецкіх гаспадарках у 1933 г. да 19 мільёнаў гектараў, у тым ліку па Зернятрэсту—9,5 мільёнаў гектараў, па жывёлагадоўчых трэстах—6 мільёнаў гектараў, па Саюзцукру—1.150 тыс. гектараў, па тэхнічных культурах (без Саюзцукру)—1.150 тыс. гектараў, Саюзнасеннаводу—800 тыс. гектараў.

2. Прыняць наступны плян разьвіцьця жывёлагадоўчых саўгасаў з давядзеньнем пагалоўя:

а) па «Скатаводу» ў 1931 годзе—да 2,8 мільёнаў галоў рагатай жывёлы, у 1932 г.—да 5 мільёнаў галоў і ў 1933 годзе—да 7 мільёнаў галоў;

б) па «Сьвінаводу» ў 1931 г.—да 1,9 млн. сьвіней, у 1932 г.—да 4,5 млн. сьвіней, і ў 1933 г.—да 6,3 мільёнаў сьвіней;

в) па «Аўцаводу» ў 1931 г.—да 4,4 мільёнаў авечак, у 1932 г.—да 9 мільёнаў авечак і ў 1933 г.—да 18 мільёнаў авечак;

г) па масьляна-малочных трэстах (разам з малочнымі фэрмамі Саюзцукру) ў 1931 г.—да 420 тысяч галоў, у 1932 г.—да 900 тысяч галоў і ў 1933 г.—да 1,5 мільёнаў галоў;

д) па птушкатрэстах у 1931 г.—да 3 мільёнаў штук, у 1932 г:—да 10 мільёнаў штук і ў 1933 г.—да 20 мільёнаў штук.

Для забесьпячэньня сапраўднага ажыцьцяўленьня гэтай праграмы разгортваньня жывёлагадоўчых саўгасаў прыняць асоба важнай задачай мэханізацыю асноўных працэсаў вытворчасьці ў жывёлагадоўчых саўгасах, для чаго павінен быць забясьпечаны выраб неабходнай для саўгасаў і калгасных фэрмаў колькасьці машын, асабліва для сенажаньня і сенаўборкі кармоў, уборкі траў і кораньплодаў, падачы вады і кармоў, электрадойкі, мэханізацыі сувязі і інш.

3. Вызначыць наступныя разьмеры таварнай прадукцыі саўгасаў:

а) у 1931 г.—550-600 мільёнаў руб. (у цэнах 1930 г.), у тым ліку 190-195 мільёнаў пуд. зярнёвых, 6—6 з паловай мільёнаў пуд. мяса, 600-700 тысяч пуд. масла, 230 мільёнаў пуд. буракоў, 2—2,5 мільёна пуд., бавоўнавалакна і 400 тысяч пуд. воўны;

б) у 1932 г.—ад 1,0 да 1,1 мільярдаў руб. (у цэнах 1930 г.), у тым ліку пры кладна на 290 мільёнаў пуд. зярнёвых, 20 мільёнаў пуд. мяса, 1,3 млн. пуд. масла, 320 млн. пуд. буракоў, 4,5 млн. пуд. бавоўна-валакна і 650 тыс. пуд. воўны;

в) у 1933 г.—ад 2,0 да 2,1 млрд. руб. (у цэнах 1930 г.), у тым ліку прыкладна 400 млн. пуд. зярнёвых, 45 млн. пуд. мяса, 2,5 млн. пуд. масла, 400 млн. пуд. буракоў, 6,5 млн. пуд. бавоўна-валакна і 1,3 млн. пуд. воўны.

Праз саўгасы ствараецца нябачаны ў сьвеце тып сельскагаспадарчай вытворчасьці. Саюз ССР зьяўляецца сапраўдным сьцяганосцам і носьбітам новых шляхоў разьвіцьця сельскае гаспадаркі ня толькі ў тых адносінах, што ў замену капіталістычнай ствараецца буйная сацыялістычная сельская гаспадарка як вышэйшая форма вытворчасьці, але і ў тых адносінах, што саўгасы—найбольш мэтазгодная форма арганізацыі працы ў сельскай гаспадарцы.

Мэтады ўдарніцтва, сацыялістычнага спаборніцтва (паміж работнікамі ўнутры саўгасаў, аднаго саўгасу з другім, саўгасы аднэй сыстэмы з саўгасам другой сыстэмы і саўгасаў з калгасамі) павінны атрымаць сапраўды масавае распаўсюджаньне, каб новыя пралетарскія кадры, якія фармуюцца на аснове саўгасаў, былі сапраўды варты тэй справы, над якой яны працуюць.

VI зьезд саветаў Саюзу ССР зьвяртаецца да ўсяго калгаснага сялянства, да ўсіх беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў.

Справа саўгасаў—наша агульная справа. Кожны крок наперад у разьвіцьці саўгасаў паляпшае матар'яльнае становішча рабочых і сялян, палягчае далейшы рост калгасаў і ўзмацняе магутнасьць Саюзу ССР. Зьезд саветаў упэўнены, што працоўныя масы Саюзу ССР з усёй энэргіяй падтрымаюць будаўніцтва саўгасаў і дадуць рашучы адпор ворагам саўгасаў—кулакам, шкоднікам, бюракратам, правым ухілістам.

Старшыня VI зьезду саветаў Саюзу ССР М. Калінін.

Сакратар VI зьезду саветаў Саюзу ССР А. Енукідзе

Масква, 17 сакавіка 1931 г.

Партыйнае будаўніцтва

Перавыбары бюро саўгасных і калгасных партыйных ячэек

важнейшае зьвяно ў падрыхтоўцы да другой калгаснай вясны

„ЦК КП(б)Б падкрэсьлівае, што асноўнымі шляхамі ўзмацненьня вясковай партыйнай арганізацыі зьяўляецца рашучая перабудова работы вясковых партыйных ячэек, паварот іх тварам да калектывізацыі, сцэцыялізацыя раёнаў, падняцьце кіруючай ролі сельскіх саветаў і ператварэньне саветаў у сапраўдных і пасьлядоўных арганізатараў барацьбы за генэральную лінію партыі". (З паст. сакр. ЦК КП(б)Б)

Саўгас і калгас—апорныя пункты партыйнай работы на вёсцы

Праграма па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, вызначаная КП(б)Б у трэцім рашаючым годзе, прадугледжвае калектывізацыю бядняцка-серадняцкіх гаспадарак да 40 проц. і павялічэньне пасеўнай плошчы ўвесну бягучага году па сацыялістычным сэктары—па саўгасах на 180.000 га і па калгасах на 1.188.000 га. Ня менш значная мерапрыемствы вызначаны і ў галіне разьвіцьця жывёлагадоўлі. На працягу году прадугледжваецца павялічэньне статку па буйнай рагатай жывёле на 21 проц. і па сьвінагадоўлі на 76 проц. Агульная сума капітальных укладаньняў у сельскую гаспадарку павялічваецца на 165.690.000. Колькасьць МТС будзе павялічана да 25 адзінак.

Зараз па ўсёй БССР разгортваецца работа па перавыбарах саўгасных і калгасных ячэек КП(б)Б. Перавыбары бюро саўгасных і калгасных ячэек КП(б)Б набываюць вялікае палітычнае значэньне і зьяўляюцца адным з найважнейшых зьвеньняў у выкананьні бявых задач трацяга рашаючага году. Ухапіцца за гэтае зьвяно—баявая задача кожнай парт'ячэйкі. Практычнае выкананьне гэтых баявых задач патрабуе ад усіх партыйных арганізацый у першую чаргу саўгасных і калгасных ячэек, яшчэ больш узмоцніць тэмпы работы, яшчэ больш мабілізаваць калгасны і бядняцка-серадняцкія масы на рашучую работу па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва як класы на аснове суцэльнай калектывізацыі. Ажыцьцяўленьне задач па суцэльнай калектывізацыі патрабуе ад саўгасных і калгасных ячэек КП(б)Б узмацненьня клясавай пільнасьці, яшчэ больш рашучай барацьбы з правымі правага апартуністычнага і «левым» скажэньнямі генэральнай лініі партыі.

Побач з такімі саўгаснымі і калгаснымі ячэйкамі, якія па бальшавіцку змагаюцца за генэральную лінію партыі, ёсьць і такія, якія пагразьлі ў балоце апартуністычнай практыкі. «Сучасная работа вясковых парт'ячэек у цэлым радзе раёнаў не забясьпечвае выкананьне гэтых важнейшых задач. Ячэйкі часта цягнуцца ў хвасьце, не забясьпечылі кіраўніцтва калгасным прылявам, не арганізуюць сваячасовага і бязьлітаснага адпору кулацкім вылазкам, праявам правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, і «левым» скажэньнем генэральнай лініі партыі» (з паст. сакр. ЦК КП(б)Б). Зразумелая рэч, што такая ацэнка дзейнасьці некаторых партыйных ячэек мае пад сабою пэўныя падставы. Падаваны сёньня матар'ял яскрава сьведчыць аб тым, што ў радзе вясковых парт'ячэек панує правапартуністычная практыка. Нежаданьне сварыцца з куляком, імкненьне апраўдаць «аб'ектыўнымі прычынамі» маючыяся прарывы ў правядзеньні палітычна-гаспадарчай кампаніі.

Праз перавыбары бюро саўгасных і калгасных ячэек трэба дамагчыся такога становішча, каб кожны вясковы камуніст узяў на сабе ўсю суму пытаньняў і тых задач, якія ўскладаюцца на яго партыяй. Перавыбары вясковых парт'арганізацый зьяўляюцца магутным сродкам у справе баявой перабудовы парт работы на вёсцы. Узмацненьне вясковага зьвяна раённых партарганізацый, стварэньне новых і ўзмацненьне існуючых парт'ячэек, узмацненьне тэмпаў іх росту за лік рабочых і батракоў, далейшае разгортваньне юрыдычнай і самаарытыкі і барацьбе з усімі скажэньнямі генэральнай лініі партыі—вось асноўныя задачы, якімі вызначаецца работа па перабудове дзейнасьці вясковых парт'ячэек і лутчэйшага ператварэньня саўгасаў і калгасаў у апорныя пункты партыйнай работы на вёсцы.

Ні ў якім разе нельга забываць ад но важнае пытаньне—гэта пытаньне аб падрыхтоўцы кіруючых кадраў для вясковых парт'ячэек. У пастанове сакратарыяту ЦК КП(б)Б з усёй рашучасьцю падкрэсьлена, што ўзмацненьне кіраўніцтва вясковымі парт'ячэйкамі, асабліва сакратарскага складу, зьяўляецца першачарговай задачай, якая падлягае неадкладнаму выкананьню.

Перавыбары бюро саўгасных і калгасных ячэек КП(б)Б павінны быць скончаны 10 красавіка. Райкомы павінны прыняць рашучыя захады да таго, каб у работе на перавыбарах і ў саміх перавыбарах бюро саўгасных і калгасных ячэек прымалі ўдзел усе партыйцы, каб перавыбары сапраўды зьявіліся магутным сродкам па мабілізацыі рабочых, калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас на выкананьне чарговых задач, пастаўленых партыяй у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Вызвесьліць апартуністаў ад партбілетаў

У радох Бярэзінскай райпартарганізацыі ёсьць члены партыі, якія ня толькі не праводзяць клясавай лініі партыі на вёсцы, але толькі шкодзяць ва ўсёй рабоце.

Возьмем некалькі прыкладаў: сакратар Гарадзішчанскай ячэйкі КП(б)Б, замест таго, каб праводзіць антырэлігійную работу ў сьвята, езьдзіў у госьці і п'янствуў. Старшыня калгасу імя Варашылава Бягун меў шчыльную сувязь з варожым элемэнтам. У выніку такой дзейнасьці пры выбарах праўленьня ўсе калгаснікі і камсамольская ячэйка былі супроць Бягуна. Аднак, райком не рэагаваў на гэта і пакінуў яго ў гэтым калгасе надалей.

Гэткія людзі і на сёньняшні дзень зьяўляюцца шкоднікамі ў пабудове сацыялізму.

Ёсьць і другая катэгорыя членаў партыі, больш небясьпечная, бо гэта прапаўнікі, якія былі кіраўнікамі раёну, якія каравалі ўсім жыцьцём раёну. Першы з іх Самец Аркадзь, член партыі з 1921 г., быў дэсэртырам, хаваўся ў людзей, якія зараз выселены, як контр-рэвалюцыянэры, займаўся кантрабандай пры польскай акупацыі, ажаніўся на жонцы былога палкоўніка, якая арыштавана і зьнята ў 1930 годзе з настаўніцтва за біцьцё вучняў. Самец знаходзіцца пад уплывам сваёй жонкі. Гэты Самец ухіліўся ад чысткі партыі; пры дапамозе былога сакратара райкому тав. Бобіхава высунут у часе ліквідацыі акруг сакратаром РК КП(б)Б, а потым старшынёй райпрафсавету, пры чым ўсюды праводзіў шкодніцкую работу. Выключыць Самца з радоў партыі мала, трэба абавязкова праверыць як прайшла чыстка саваларату на тэрыторыі Бярэзінскага раёну, бо гэты-ж Самец быў членам камісіі па чысткі.

Акрамя гэтых таварышоў, вельмі па даэронным зьяўляецца былы сакратар РК КП(б)Б тав. Бобіхаў, які ўкрываў ў часе чысткі партыі ўсіх гэтых людзей. Тав. Бобіхаў—сын кулака; працуючы ў каапэрацыі ён трымаў у апараце пазбаўленцаў. Зараз ён—старшыня Райспажыўтаварыства; на яго заведзена ў пракуратуры 8 справ за тое, што пагнаіў бульбу, ігнараваў мабілізацыю сродкаў і інш. Райком КП(б)Б замазвае гэтыя факты і ня ўжывае ніякіх захадаў.

Перавыбары бюро вясковых парт'ячэек павінны выкрыць усю апартуністычную гніль, якая ўсімі сродкамі і сіламі імкнецца паслабіць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Джала.

Партячэйка на верным шляху

Шырокае растлумачэньне Навасёлкаўскай партыйнай ячэйкай пастаноў сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК сярод саўгасных рабочых, калгаснікаў, батрацка-бядняцкіх і серадняцкіх мас Радутскага сельскага савету, Жлобінскага раёну, дало адпаведныя зрухі ў рабоце. У выніку ў в. Радуга арганізаваны калгас з 23 гаспадарак імя «Трэцяга рашаючага году пяцігодкі». Па ініцыятыве партыйнага сходу была вынесена прапанова аб дадатковай падпісцы на пазыку «Пяцігодка ў чатыры гады», сабрана сярод прысутных на сходзе 570 руб.

Гэткія мэтады перабудовы работы самі ўсобе апраўдалі і апраўдваюць. Мы маем за апошні час прыліў у калгас да 50 гаспадарак, якія ўжо заняліся абагульваньнем маемасьці і складаньнем вясновага пасеўнага плану.

Пляннавае правядзеньне штодзённай работы пры правільнай растаноўцы партыйных сіл таксама мае вялікае значэньне. У выніку выяўленьня кулацкіх гаспадарак, дачы цьвёрдых заданьняў заможным гаспадаркам, давядзеньня да двара пляну веснавой пасеўнай кампаніі, правядзеньня спраўдзачна-перавыбарчай кампаніі калгасу «Чырвоны Баец»—мы маем прыліў у 30 гаспадарак і арганізацыю адной ініцыятыўнай групы, што зьяўляецца замацаваньнем старога калгасу.

Побач з правядзеньнем такой работы ячэйкай вядзецца рашучая барацьба з культаямі, малаверамі і ныцікамі. Так. Дзянісаву І. пастаўлена на від за ненаведваньне партсходу, Рожын І., за сыстэматычнае невыкананьне пастаноў ячэйкі выключан з партыі.

Ячэйка, замест такіх трусоў, малавераў і ныцікаў, за апошнія месяцы прыняла ў рады КП(б)Б з асяродзьдзя рабочых батрацка-бядняцкай і калгасной масы 7 чал., ячэйка і надалей будзе весьці барацьбу з розным разгільдзяйствам, балбатнёй і права-апартуністычнымі настроямі. Перавыбары ячэйкі яшчэ больш замацуюць дасягнутыя посьпехі, яшчэ лепш наладзяць далейшую работу.

Ф. Е. Яськоў.

Лічаныя дні засталіся да пачатку будаўнічага сэзону

Без дакладна, не спасылаючыся на „аб'ектыўныя" прычыны забясьпечыць будаўніцтва чарцяжамі, праектамі, будматар'яламі і рабочай сілай

Давесьці прамфінплян да будаўніцтва, да кожнага рабочага-будаўніка

Ліквідаваць безгаспадарчасьць, зрушыць з мёртвай кропкі сацспаборніцтва і ўдарніцтва

Сацспаборніцтва, як адзін з мэтадаў пасьпяховага ажыцьцяўленьня задач сацыялістычнага будаўніцтва, ня толькі ня ўзьнята на будаўнічай базе Белжылсаюзу на адпаведную палітычную вышыню, а сьвядома ігнаруецца. Аб гэтым яскрава сьведчаць факты прагулаў, спазьненьняў і няўхі на работу бяз уважлівых прычын. Такое зьявішча стала звычайным. Напрыклад, рабочыя Зінькоўскі і Мінковіч прагулялі 15 дзён бяз уважлівых прычын і ні адміністрацыя, ні рабчком на такія зьявішчы не рэагуюць. Таксама на базе Белжылсаюзу няма плянавасьці ў работе. Работа праходзіць самацёкам. Прамфінплян адсутнічае. З прычыны адсутнасьці плянавасьці ў рабоце часта бываюць прастоі па віне адміністрацыі. Былі выпадкі, калі 12 цесьляроў прастаялі 8 гадзін і адміністрацыя не паклапацілася аб прадастаўленьні ім работы, што ў выніку ўдаражае будаўніцтва. Ударніцтва таксама правалена. У сталярным цэху працуюць 4 брыгады сталяроў. З гэтых 4-х брыгад толькі адна брыгада абвясьціла сябе ўдарнай. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі сацспаборніцтва і ўдарніцтва не арганізоўваюць. Нават не афармлена тая брыгада, якая абвясьціла сябе ўдарнай. Расьце колькасьць адміністратараў, і ня гледзячы на вялікую колькасьць «адміністратараў» безгаспадарчасьць сустракаецца на кожным кроку. Першасортны матар'ял ляжыць пад адкрытым небам у сьнезе і псуецца, а адміністрацыя не дагадваецца пабудаваць навесь. Дзьве цэмантна-бэтонамяшалкі стаяць на дварэ ды іржавеюць.

Усе гэтыя факты гавораць за тое, што на базе Жылбуду патрэбны рашучы пералом у рабоце. Неабходна партыйнаму калектыву і прафарганізацыі больш заняцца пытаньнямі аб палепшаньні работы на ўсіх галінах на базе Жылбуду.

Г. Ліўшыц.

Капітальнае будаўніцтва па „Будаб'яднаньні"—пачаць своячасова

У гэтым годзе на будаўніцтва па «Будаб'яднаньні» ўрадам асыгнавана 32 мільёны руб. супроць 26 млн., выдаткаваных у 1930 годзе, якія галоўным чынам будуць укладзены ў будаўніцтва прамысловага, грамадзка-камунальнага і жыльлёвага характару.

Капітальнае будаўніцтва, галоўным чынам, будзе праводзіцца ў Менску, Гомлі і Віцебску. Будаўніцтва ў гэтых гарадох па пляну патрабуе больш увагі на дадзены перыяд часу і павінна быць выканана ў тэрмін.

Будаўнічы сэзон сёлета пачынаецца з 15-га красавіка і будзе весьціся круглы год, хоць летась будаўніцтва некаторых аб'ектаў таксама ішло бесь перапынку.

Сёлета па прамысловаму будаўніцтву вызначана шмат вялікіх аб'ектаў, як будаўніцтва галянтарэйнай і абутковай фабрык, цукерні і інш.

Таксама будзе праводзіцца сканчэньне пабудовы Гомсельмашу, пабудова косьцяапрацовачнага заводу, серкавугляроднага і ацэтонавага заводаў у Быхаве, сканчэньне пабудавы шоўкавай фабрыкі, лёнапяньковага камбінату ў Воршы, панчошнай фабрыкі ў Віцебску і вапеннага заводу. Па грамадзка-камунальным будаўніцтве будзе пабудаваны дом Ураду, дом друку, будвуч, лазьня гараж і ясьлі па жыльлёваму—дом АДПУ, інтэрнат хэміка-тэхналёгічнага інстытуту мэханічны інстытут, будтэхнікум і жылы дом харчавікоў. Акрамя гэтага Будаб'яднаньне будзе праводзіць вялікае будаўніцтва «будаўнічага двара» на які асыгнавана 300 тыс. руб.

Адсюль відаць, што пры належнай пастаноўцы работы заданьне па будаўніцтву можна будзе выканаць. Кіраўніцтва Будаб'яднаньня павінна забясьпечыць своячасовую падрыхтоўку да будаўнічага сэзону. Тэмпы існуючай падрыхтоўкі недастатковыя. Трэба больш рашуча змагацца за ажыцьцяўленьне вялікай праграмы будаўніцтва. Пры актыўным удзеле рабочых пабудоў трэба змагацца са шкодніцтвам і кансэрватызмам паасобных спэцыялістаў, выкарчаваць рэшткі апартуністаў сярод кіруючага складу будаўніцтва.

Р. Кацнэльсон.

Ударная брыгада будаўнікоў за работай.

Адвесьці пагрозу зрыву

На Аршаншчыне да будаўнічага сэзону ня рыхтуюцца

Сёлета Аршанская Жылбудкантора павінна будзе разгарнуць вялікае будаўніцтва.

Кантрольныя лічбы коштуе ўсіх будаўнічых работ вызначаны цэнтрам ў 3,5 млн. руб.

З агульных аб'ектаў будаўнічых работ, што вызначаны плянам на гэты год, будуць праводзіцца работы па дабудове ў Воршы двух дамоў—аднаго на 20 кватэр і другога на 48, па дабудове заразнага бараку, 48 кватэр нага дому ў Дуброўне, Талочынскай і Баранскай сямігодак. На сканчэньне гэтых работ адпушчана 670.000 руб.

Аб'екты новага будаўніцтва на гэты год значныя. Мяркуецца пабудова двух драўляных аднапавярховых дамоў у Воршы, пабудова памяшканьня пад вучпункт, і мэханічнай майстэрні Дарбудвуча.

Пры заводзе «Чырвоны Кастрычнік», дзе жыльлёвае пытаньне стаіць вельмі востра, у гэтым годзе мяркуецца пабудаваць адзін трохпавярховы дом на 30 кватэр і новую грамадзкую сталоўку.

Для Гаркамбінату будзе будавацца новая мэханічная майстэрня і гараж.

Пры мясным і ільняным камбінатах будуць будавацца два дамы, адзін Жакту «Чырвоны Аршанец» на ст. Ворша для рабочых чыгуначнікаў і другі дом на 60 кватэр.

Звыш гэтага па Аршанскім раёне будуць будавацца 4 аднакамплектныя школы і адна сямігодка.

Таксама мяркуецца значнае будаўніцтва і па іншых раёнах. У Дуброўне —32-хкватэрны дом, Дом Саветаў, гасьцініца, лазьня і г. д., у Копысі—сямігодка, лазьня і больніца.

На асноўныя аб'екты работ праекты, каштарысы і чарцяжы ўжо маюцца, але ўмоў з работадаўцамі па большасьці новых аб'ектаў ніхто яшчэ не заключыў.

З прычыны адсутнасьці ўмоў, Будкантора дала зьвесткі на дэфіцытныя будаўнічыя матар'ялы толькі на тыя аб'екты, на якія маюцца ўмовы.

З патрэбнай колькасьці лесаматар'ялаў 75 проц. будуць атрыманы ад распрацоўкі адведзенага ляснога вучастку. Але распрацоўкі толькі яшчэ разгортваюцца.

Каб выканаць усе аб'екты будаўніцтва, патрэбна будзе 203, 260 чалавека-дзён рабочай сілы. Заяўкі даны, але мясцовая біржа працы не спраўляецца з гэтым, бо заяўку канторы ў лютым месяцы на 165 чалавек рабочых яна ня выканала.

З-за адсутнасьці рабочых сарваўся зімовы сэзон.

Тэхнічнага пэрсаналу таксама не хапае на 70 проц.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што жыльлёвае будаўніцтва на Аршаншчыне стаіць перад пагрозай зрыву. Ні ў якім разе работадаўцы і Жылбудкантора пры чарапашых тэмпах сваёй работы не пасьпеюць падрыхтавацца да будаўнічага сэзону.

Пагроза зрыву павінна быць адведзена. Адпаведныя арганізацыі павінны праверыць работу па падрыхтоўцы да сэзону жылыёвага будаўніцтва, а работадаўцаў—адміністрацыю заводу «Чырвоны Кастрычнік», Дуброўнскі і Копыскі Райвыканкомы, Аршанскі Дарбудвуч, і Гаркамбінат, якія сваёй бязьдзейнасьцю зрываюць падрыхтоўку да будаўнічага сэзону, павінны прыцягнуць да адказнасьці.

Апартунізм з яго стаўкай на самацёк павінен быць вырваны з карэньнем. Будаўнічы сэзон павінен быць пачаты своячасова.

А. Мілашэўскі.

НАША Кансультацыя да другой бальшавіцкай

Пад лён можна заняць 25-30 проц. плошчы ў гаспадарцы

Пашырана думка аб тым, што лён можна сеяць на адным і тым-жа месцы не раней, як праз 6—8 гадоў. Гэта думка грунтуецца на вопытах бязьвыменнай сяўбы лёну на адным месцы. У гэтым выпадку наглядаецца наступнае зьявішча: 2—3 гады лён дае нармальны ўраджай, а потым ураджай пачынае зьніжацца і праз 6—8 гадоў лён зусім перастае расьці на гэтым месцы. Тлумачыцца гэта тым, што ў глебе зьяўляюцца асобныя шкодныя грыбкі, якія і ўплываюць адмоўна на ураджай лёну і ствараюць так званую стомленнасьць глебы. Да апошняга часу лічылі, што ёсьць толькі адзіны спосаб барацьбы з готымі хваробамі—сеяць лён на [illegible] месцы не раней, як праз 6—8 гадо

Аб рабоце Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР

Пастанова X-га Ўсебеларускага Зьезду Саветаў

1. Дзесяты Ўсебеларускі Зьезд Саветаў, заслухаўшы даклад Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі БССР, адзначае, што за два гады, якія прайшлі з часу апошняга Ўсебеларускага Зьезду Саветаў прамысловасьць дасягнула вялізарнейшых посьпехаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва. Пляны першых двух год пяцігодкі перавыкананы амаль па ўсіх галінах, што забясьпечвае пры ўжо дасягнутых тэмпах будаўніцтва выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, а па некаторых галінах нават і ў тры гады.

Гэтыя вялізарныя дасягненьні ў разьвіцьці сацыялістычнай прамысловасьці БССР атрыманы пры рашучым наступленьні на капіталістычныя элемэнты па ўсім фронце, ня гледзячы на супраціўленьне клясавага ворага — нэпманаў, кулацтва, шкодніка ў, нацыянал - дэмакратаў—агентаў міжнароднай буржуазіі. Гэтыя дасягненьні зьяўляюцца вынікам правільнага Ленінскага кіраўніцтва з боку КП(б)Б гаспадарчым будаўніцтвам, вынікам рашучай барацьбы з правым ухілам, як найбольш небясьпечным на гэтым этапе, з левымі загібамі, бес прынцыповымі блёкамі і прымірэнцтвам да іх, з нацыянал-апартуністымі за Ленінскае правядзеньне нацыянальнай палітыкі, а таксама вынікам сталай дапамогі Савецкага Саюзу, накіраванай да ўздыму эканамічна і культурна адсталых нацыянальных рэспублік. Гэтыя посьпехі сталі магчымымі толькі дзякуючы вялізарнай актыўнасьці рабочай клясы, росту яе творчага энтузіязму, які сказваецца ў сацыялістычным спаборніцтве і ўдарніцтве, у перарастаньні сацыялістычнага спаборніцтва ў вышэйшыя формы сапраўднай камуністычнай працы, у выніку пачаўшайся перабудовы работы ўсіх органаў пралетарскай дыктатуры, пад лёзунгам мабілізацыі мас за бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнай рэканструкцыі прамысловасьці.

2. У выніку выкананьня гістарычных пастаноў IX Усебеларускага Зьезду Саветаў узмацнілася і пашырылася пралетарская база БССР, як фарпосту Саюзу СССР на Заходзе. Значна ўзрасла ўдзельная вага прамысловай прадукцыі ў агульнай прадукцыі ўсяе народнае гаспадаркі краіны, на падставе разгорнутага буйнага прамысловага будаўніцтва, якое грунтавалася галоўным чынам на скарыстаньні мясцовай, а таксама на прывознай транспартабельнай сыравіне.

Капітальныя ўкладаньні за першыя 2 гады пяцігодкі і асобную квадру па рэспубліканскай (ВСНГ, НКС) і саюзнай прамысловасьці складаюць звыш 90 млн. руб., што перавышае меркаваньне 5-цігадовага пляну і цалкам забясьпечвае выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады. На базе новага капітальнага будаўніцтва і рэканструкцыі існаваўшага асноўнага капіталу прамысловасьць дасягнула значных посьпехаў у справе падвядзеньня больш высокай тэхнічнай базы. Арганізаваны і арганізуюцца новыя вытворчасьці ў хэмічнай прамысловасьці, тарфяной, мэталяпрацоўчай, сылікатнай, гарбарнай і інш.

Валавая прадукцыя рэспубліканскай прамысловасьці на працягу двух год пяцігодкі ўзрасла на 150 проц. супроць меркаваньняў зацьверджанага IX Усебеларускім Зьездам Саветаў па цігадова пляну—87 проц. У 1929-30 г. прырост прадукцыі прамысловасьці складаў 68 проц. супроць 48 проц. у 1928-29 г. Фактычны рост прадукцыі прамысловасьці ў 1929-30 г. перавысіў плянавыя заданьні пяцігодкі на 33 проц.

3. На прунце шпаркага разгортваньня прамысловасьці значна ўзрасла рабочая кляса ў БССР. Толькі па прамысловасьці ВСНГБ колькасьць рабочых павялічылася з 25.683 чал. у 1927-28 г. да 46.829 чал. у 1929-30 г. Палепшылася матар'яльнае і культурна-бытавое становішча рабочае клясы. Заработная плата за два гады ўзрасла на 16 проц. Павялічыліся асыгнаваньні на ахову працы (за адзін толькі 1929-30 г. на ахову працы, жылбудаўніцтва, ясьлі, сталовыя, клюбнае будаўніцтва выдаткована 4.978 тыс. р.). Фонд сацыяльнага страхаваньня павялічыўся з 22.839 т. р. у 1928-29 г. да 24.334 т. р. у 1929-30 г., а на 1931 г. вызначана 44.976 т. р. Пераведзены на 7-мі гадзінны рабочы дзень па прамысловасьці ВСНГ на 1-е кастрычніка 1930 г. 52,3 проц. рабочых, на бесьперапынку—79,4 проц.

4. Разам з рэспубліканскай прамысловасьцю значных посьпехаў дасягнула мясцовая і саматужная прамысловасьць. Прадукцыя ўсёй мясцовай прамысловасьці, якая грунтуецца пераважна на мясцовай сыравіне (будма тар'ялы, дрэваапрацоўчая, харчавая), за другі год пяцігодкі склала 80 проц. прадукцыі (27 млн. руб.) апошняга году пяцігодкі, што забясьпечвае выкананьне пяцігадовага пляну ў тры гады. Капітальныя ўкладаньні ў мясцовую прамысловасьць за два гады і асобную квадру склалі 15 млн. руб., альбо 62,4 проц. капітальных укладаньняў, прадугледжаных для ўсяе пяцігодкі. У 1929-30 г. 53,8 проц. усіх капітала-ўкладаньняў накіравана на капітала ўкладаньні ў прамысловасьць будаўнічых матар'ялаў.

Саматужна-прамысловая кааперацыя, праводзячы ачыстку арцеляй і барацьбу з прасякненьнем ў кааперацыю клясава-варожых элемэнтаў, дасягнула значных посьпехаў як у галіне агульнага росту выробленай прадукцыі (ў 1928-29 г. 34864 т. р. 1929-30 г. 58213 т. руб., на 1931 г. вызначана 128.210 т. руб: Рост у каапераваньні на 1-е кастрычніка 1928 г.—10.957 чал. на 1-е кастрычніка 1929 г. —18.087 ч., на 1-е кастрычніка 1930 г. —33.858 ч.), так і ў галіне пашырэньня выробу з мясцовай сыравіны і каапераваньня працоўных на вёсцы.

5. Бурны рост сацыялістычнай прамысловасьці патрабаваў асаблівай увагі да справы падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў. За апошні год арганізаваны 5 вышэйшых тэхнічных навучальных устаноў і 12 тэхнікумаў. Рабочыя, батракі і беднякі, калгасьнікі і іх дзеці па вышэйшых тэхнічных навучальных установах складаюць 90,3 проц., па тэхнікумах—87,8 проц. Значна пашырылася сетка ФЗВ. (У 1928-29 г. з ФЗВ—280 вучняў, зараз 21 ФЗВ з кантынгентам у 4.247 чал.). Разам з гэтым утворан грунт для разьвіцьця навукова-дасьледчай працы ў выглядзе Навукова-Дасьледчага Інстытуту Прамысловасьці.

6. Шпаркае разьвіцьцё прамысловасьці за апошнія гады, дасягнутыя вялізарнейшыя посьпехі ў сацыялістычным будаўніцтве краіны забясьпечылі поўную магчымасьць запраектаваць высокія тэмпы разьвіцьця прамысловасьці ў 3-м рашаючым годзе пяцігодкі.

Аб'ём валавой прадукцыі па рэспубліканскай прамысловасьці ВСНГ намечан у 1931 г. у 434 млн. руб., што дае прырост прадукцыі на 74 проц. супроць папярэдняга году. Плян капітальнага будаўніцтва па прамысловасьці ВСНГ БССР вызначан у 43 млн. руб. Прырост рабочых устаноўлен на 34 проц., вытворчасьць працы на 30 проц., зарплата на 6 проц. На сацыяльна-бытавыя патрэбы рабочых выдаткі налічаны ў разьмеры 6,5 млн. р. Зьніжэньне сабекошту вызначана ў 1931 г. на 8 проц. На працягу 3-га рашаючага году пяцігодкі павінны быць окончаны ў асноўным ўсе пачатыя больш буйныя прадпрыемствы, як-то: цэмантны завод, мэханізаваная гута, трыкатажная ф-ка, ацэтонавы завод і шэраг інш. пабудоў.

7. Разам з гэтымі вялізарнымі посьпехамі сацыялістычнай прамысловасьці ў Беларускай ССР у паасобных важнейшых галінах мае месца недавыкананьне прамфінпляну 1929-30 г. і асобнай квадры па колькасных паказьніках (лес, фасфарыт, торф) і ў асаблівасьці па якасных — зьніжэньне сабекошту, падвышэньне вытворчасьці працы, палепшаньне якасьці прадукцыі, якая ўсё яшчэ ў шэрагу галін прамысловасьці застаецца нездавальняючай, што зьяўляецца абсалютна недапушчальным.

Недавыкананьне праграм па торфе і лесавывазцы стварае напружанасьць паліўнага балянсу.

Гэткае становішча ўтварылася ў выніку недастатковай перабудовы работы самой прамысловасьці, недастатковага скарыстаньня ўнутраных рэсурсаў, слабага правядзеньня рацыяналізацыі і барацьбы са стратамі, недавальняючага тэхнічнага кіраўніцтва прамысловасьцю, неаўладаньня тэхнікай з боку кіруючага складу, недастатковай насычанасьці тэхнічнымі кадрамі, няпоўнага правядзеньня рэарганізацыі кіраўніцтва прамысловасьці, няпоўнага пераводу на гаспадарчы разрахунак прадпрыемстваў і цэхаў, неўдасканаленьня дагаворных адносін, выпадкаў скарыўленьняў у правядзеньні адзінаначальля, нездавальняючай работы органаў снабжэньня сыравінай і паливам, а таксама недастатковага скарыстаньня творчага энтузіязму і ініцыятывы рабочых мас у справе барацьбы за палепшаньне работы прамысловасьці.

Гэтыя недахопы павінны быць цалкам зьнішчаны для забясьпечаньня па трэбных тэмпаў разьвіцьця сацыялістычнай прамысловасьці, для выкананьня задач, якія стаяць у 3-м рашаючым годзе пяцігодкі па выкананьні як колькасных, так і якасных паказьнікаў.

8. Асноўным мерапрыемствам па зьнішчэньні недахопаў работы прамысловасьці павінна стаць палепшаньне сыстэмы кіраўніцтва прамысловасьцю, сапраўднае ажыцьцяўленьне рэарганізацыі кіраўніцтва прамысловасьцю. Усе прадпрыемствы і буйныя цэхі павінны быць бязумоўна пераведзены на суровы гаспадарчы разрахунак, у асноў дагаворных адносін неабходна палажыць матар'яльную адказнасьць пастаўшчыка перад заказчыкам за тэрмін заказаў і якасьць яго выкананьня.

Палепшаньне якасьці кіраўніцтва прамысловасьцю і паасобнымі прадпрыемствамі патрабуе самага рашучага разгортваньня з боку ВСНГ і гаспадарнікаў шэрагу мерапрыемстваў па аўладаньні тэхнікай камандным складам прамысловасьці.

У мэтах шырокага ўкараненьня тэхнікі ў масы, Зьезд даручае Народнаму камісарыяту асьветы адпаведна перабудаваць працу палітасьветных устаноў (нардамы, хаты-чытальні). ВСНГ і іншым гаспадарчым арганізацыям кожнае свае прадпрыемства зрабіць пунктам па распаўсюджваньні тэхнічных ведаў сярод шырокіх мас працоўных.

9. Сучаснае становішча прамысловасьці з усёй катэгарычнасьцю патрабуе ўзмацненьня сапраўднага тэхнічнага кіраўніцтва прадпрыемствамі, якое падмяняецца ў шэрагу выпадкаў папяровым кіраўніцтвам з боку гаспадарнікаў. «Трэба самім стаць спэцыялістымі гаспадарчай справы, трэба павярнуцца тварам да вытворчасьці, тварам да тэхнічных ведаў—вось куды штурхала нас жыцьцё». (Сталін).

Гэта задача патрабуе ад кожнага дырэктара прадпрыемства, ад кожнага гаспадарніка рашучага адмаўленьня ад кіраўніцтва толькі подпісам папер, патрабуе дэталёвага вывучэньня ўсяе даручанае справы, у першую чаргу вытворчага працэсу, тэхнікі, фінансава-эканамічнага боку, памятуючы, што «тэхніка ў пэрыяд рэканструкцыі вырашае ўсё». (Сталін).

10. Зьезд Саветаў лічыць неабходным для палепшаньня кіраўніцтва прамысловасьцю, поўнае ажыцьцяўленьне адзінаначальля, якое ва ўмовах сацыялістычнай рэканструкцыі павінна ўтварыць неабходныя прадпасылкі для найбольшага выкарыстаньня ўсіх магчымасьцяй у дасягненьні вышэйшых тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Грунтам для правядзеньня адзінаначальля павінна стаць аўладаньне тэхнікай з боку адміністратара-кіраўніка прадпрыемства, поўнае ўяўленьне з боку гаспадарнікаў усёй адказнасьці за даручаную справу, за вытворчы працэс, тэхніку, фінансава-эканамічнае становішча.

11. Улічваючы вялізарны разьмер капітальнага будаўніцтва прамысловасьці і недастатковую падрыхтаванасьць да будаўнічага сэзону 1931 г. неабходна дабіцца: найбольш мэтазгоднага і эканомнага ўкладаньня сродкаў у прамысловасьць, паскарэньня будаўніцтва і асваеньня пабудоў, лепшай падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону і сваячасовага і здавальняючага булаўнічага і каштарыснага праектаваньня. Неабходна дасягнуць эканоміі ў выдаткаваньні дэфіцытна-будаўнічых матар'ялаў і замены будматар'ялаў мясцовага паходжаньня, патаненьня будаўніцтва на працягу 1931 г. на 15 пр., палепшаньня яго якасьці шляхам найбольш рацыянальнай арганізацыі будаўнічых работ, скарыстаньня мэханізмаў, арганізацыі працы і падвышэньня яе вытворчасьці.

12. Зьніжэньне сабекошту і палепшаньне якасьці прадукцыі павінна стаць у цэнтры ўвагі гаспадарчых і грамадзкіх арганізацый прадпрыемстваў. Кожнае прадпрыемства, цэх, агрэгат павінны мець дэталёва-распрацаваны плян зьніжэньня сабекошту па паасобных артыкулах і квартальнасовую справаздачнасьць па іх. Ацэнка дзейнасьці прадпрыемства павінна ў першую чаргу выходзіць з выкананьня пляну і зьніжэньня сабекошту, памятаючы, што «хто ня выконвае зьніжэньне сабекошту, той урэзвае сродкі на капітальнае будаўніцтва». (Орджанікідзе).

Разам з тым неабходна рашучае палепшаньне якасьці прадукцыі, не дапушчаючы ні ў якім разе зьніжэньня сабекошту за кошт пагоршаньня якасьці, прыцягнуўшы рабочага спажыўца да актыўнага ўдзелу ў справе палепшэньня якасьці прадукцыі.

13. Выкананьне грандыёзных пляноў разьвіцьця прамысловасьці патрабуе максымальнага скарыстаньня ўсіх магчымасьцяй самой прамысловасьці, правядзеньня мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, рашучай барацьбы са стратамі на вытворчасьці, шырокага ажыцьцяўленьня рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў і інш.

14. Недахоп паліва патрабуе самай жорсткай эканоміі яго, карэннога перагляду паліўнага балянсу ў бок рашучага пераходу на мясцовыя віды паліва (торф), забясьпечыўшы поўнае 100 проц. выкананьне як загатоўкі, так і вывазкі торфу і дроў, ўжываньне ў якасьці паліва розных адкідаў, пераходу да найбольш эфэктыўнай здабычы мясцовага паліва.

Першачарговай задачай павінна стаць цьвёрдае ажыцьцяўленьне эканоміі па ўсіх галінах спажываньня і рацыяналізацыі энэрга-цеплавой гаспадаркі і паліва.

15. Перабоі ў справе сыравённага снабжэньня, а таксама снабжэньня будаўніцтваў будматар'яламі, якія маюць месца ў некаторых галінах прамысловасьці, вымагаюць ад усіх снабжэнцкіх, гаспадарчых і транспартных арганізацый палепшаньня сваёй работы, перабудовы яе ў адпаведнасьці са стаячымі перад прамысловасьцю задачамі.

16. Становішча вучоты і справаздачнасьці, асабліва па якасных паказьніках, у сучасны момант не адпавядае запатрабаваньням прамысловасьці ў рэканструкцыйны пэрыяд. Значнае спазьненьне справаздачнасьці не даваляе сваячасова рэагаваць на тыя ці іншыя адхіленьні ад пляну, сваячасова мабілізаваць прамаджасьць для зьнішчэньня перашкод у выкананьні пляну. Таму, X Усебеларускі Зьезд Саветаў абавязвае Вышэйшы Савет Народнае Гаспадаркі і ўсе гаспадарчыя арганізацыі рашуча перабудаваць работу органаў вучоты і справаздачнасьці, ператварыўшы іх у сапраўдную зброю кіраўніцтва сацыялістычнай прамысловасьцю.

17. Ажыцьцяўленьне складаных задач, якія стаяць перад прамысловасьцю ў 3-м рашаючым годзе пяцігодкі патрабуе далейшага актыўнага ўдзелу рабочых мас у іх выкананьні. Гэта патрабуе далейшай мабілізацыі і ўсямернага скарыстаньня творчай актыўнасьці, ініцыятывы шырокіх рабочых мас, пашырэньня збору рабочых прапаноў, іх ажыцьцяўленьня, найхутчэйшага правядзеньня ў жыцьцё рабочых вынаходзтваў і поўнага скарыстаньня фондаў па прэміраваньні за прапановы па палепшаньні вытворчасьці і за вынаходзтва. Зьезд Саветаў рашуча патрабуе ад гаспадарчых арганізацый самай жорсткай барацьбы з праявамі з боку паасобных гаспадарнікаў бюракратычных адносін да скарыстаньня ініцыятывы працоўных сацыялістычнага спабор-ніцтва і ўдарніцтва, да справы палепшаньня работы прадпрыемстваў.

Гэта патрабуе ад прафсаюзаў больш чоткага і безадкладнага ажыцьцяўленьня павароту тварам да вытворчасьці, сапраўднага пераносу цэнтру прафработы ў цэх, агрэгат, брыгаду, сапраўднай перабудовы работы вытворчых нарад, палепшаньня канкрэтнага кіраўніцтва ўсімі формамі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, правядзеньня рашучай барацьбы з ілжэўдарніцтвам, хутка пераносячы вопыт лепшых прадпрыемстваў на адсталыя і гэтым самым стымулуючы далейшае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва ў яго новых вышэйшых формах.

18. Ліквідацыя ў асноўным беспрацоўя ў БССР, высокія тэмпы штогоднага ўцягненьня рабочай сілы ў вытворчасьць, нізкая забясьпечанасьць прамысловасьці тэхнічнай кваліфікаванай сілай патрабуюць далейшага ўзмацненьня ўвагі да існуючай сеткі навучальных устаноў у напрамку задавальненьня іх неабходным абсталяваньнем, адпаведнай площчай і навуковымі кадрамі, падвышэньня якасьці рыхтаваных спэцыялістаў.

Маючыйся дэфіцыт у кваліфікаваных тэхнічных кадрах, патрабуе далейшага шпаркага разгортваньня вышэйшай і сярэдняй асьветы, асабліва ў справе падрыхтоўкі спэцыялістых па торфа-прамысловасьці.

Прамысловасьць, якая рэконструюецца з асаблівай вастратой высоўвае неабходнасьць перакваліфікацыі існуючых кадраў рабочых і шпаркага разгортваньня ФЗУ і ШУМПГаў, як асноўных крыніц падрыхтоўкі новых кадраў кваліфікаваных рабочых сілы для прамысловасьці. Гэта ў сваю чаргу ставіць задачу шпаркага разгортваньня іх капітальнага будаўніцтва і абсталяваньня.

З боку НК Працы павінны быць ужыты самыя рашучыя меры задавальненьня запатрабаваньняў прамысловасьці ў кваліфікаваных рабочых сіле, у асаблівасьці на сэзонных работах, у будаўнічай і тарфяной, з тым, каб забясьпечыць поўнае выкананьне намечаных пляноў разгортваньня прамысловасьці.

Грандыёзны плян будаўніцтва сацыялістычнай прамысловасьці ў 3-м рашаючым годзе пяцігодкі, патрабуе значнага ўцягненьня новых кадраў рабочых.

Адным з моцных рэзэрваў уцягненьня рабочай сілы павінна зьявіцца праца над сыстэматычным прытокам і ўкараненьнем у прамысловасьць жаночай працы, (жонкі рабочых, члены сям'і рабочых, слабодная жаночая працоўная сіла ў калгасах).

Зьезд прапануе Вышэйшаму Савету Народнае Гаспадаркі і Народнаму Камісарыяту працы поўнасьцю забясьпечыць выкананьне пляну ўкараненьня жаночай працы на 1931 г., а таксама і распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па гэтым пытаньні на бліжэйшыя гады.

19. Разгортваньне прамысловасьці БССР на базе вывучэньня прыродных рэсурсаў ставіць як першачарговую задачу далейшае разгортваньне навукова-дасьледчай справы шляхам разгортваньня сеткі фабрычна-заводзкіх лябараторый, арганізацыі шэрагу галіновых інстытутаў і ўзмацненьня існуючага інстытуту прамысловасьці.

Бліжэйшай задачай навукова-дасьледчых устаноў павінна стаць барацьба за якасьць прадукцыі, за рацыянальнае выкарыстаньне сыравінных рэсурсаў БССР і ў асаблівасьці торфу, як паліўнай базы і крыніц разьвіцьця новых галін прамысловай гаспадаркі БССР.

20. Справе рабочага снабжэньня неабходна надаць выключную ўвагу. З боку органаў кааперацыі і НКСнабу трэба ўжыць усе меры да перабудовы сваёй працы ў галіне рабочага забясьпечаньня, у тым, каб ўнесьці сапраўднае палепшаньне ў абслугоўваньне рабочых фабрык і заводаў і будаўніцтваў паводле маючыхся рашэньняў дырэктыўных органаў. З свайго боку гаспадарчыя арганізацыі павінны ўявіць сабе, што выкананьне задач, якія стаяць перад прамысловасьцю, патрабуе ўвагі і дапамогі кааперацыйным арганізацыям у правядзеньні мерапрыемстваў, палягшаючых справу рабочага забясьпечаньня.

21. Выходзячы з палітыкі партыі, накіраванай на ўздым эканамічна і культурна адсталых нацыянальных рэспублік, утварэньне моцнай пралетарскай базы ў БССР, патрэбна і надалей захаваць падвышэньня ў параўнаньні з сярэднімі па Саюзе ССР тэмпы прамысловага разьвіцьця БССР.

Асаблівая ўвага павінна быць звернута на разьвіцьцё галін прамысловасьці, якія грунтуюцца на мясцовай сыравіне; разам з тым, паколькі абмежаваныя сыравінныя рэсурсы БССР не забясьпечваюць дастатковых тэмпаў разьвіцьця прамысловасьці, павінны атрымаць далейшы рост тыя галіны, якія працуюць на прывозной транспартабельнай сыравіне.

Грунтам у разьвіцьці прамысловасьці павінны стаць шырачэзнае скарыстаньне мясцовай, багатай тарфяной паліўнай базы і больш хуткае разгортваньне электрафікацыі на тарфяным паліве.

22. Ажыцьцяўленьне пляну электрафікацыі БССР, ня гледзячы на пуск Беларускай Дзяржаўнай Раённай Электрычнай Станцыі імя Сталіна, далёка не забясьпечвае патрэб буйна растучай прамысловасьці, сельскай гаспадаркі, якая рэканструюецца, і гарадоў, між тым, як наяўныя паліўныя рэсурсы ў выглядзе торфу, цалкам забясьпечваюць разгортваньне энэргагаспадаркі Беларускай СССР.

X Усебеларускі Зьезд Саветаў даручае Ўраду БССР рашуча ажыцьцявіць намечаныя пляны электрафікацыі Беларускай ССР, шляхам пабудовы ў першую чаргу Гомельскай Дзяржаўнай Раённай Электрычнай Станцыі, Менскай Цепла-Электрацэнтралі ў адпаведнасьці з вызначанымі плянамі.

23. Паліўныя цяжкасьці, якія перажываюць народная гаспадаркай, аба вязваюць з усёй рашучасьцю дабіцца пашырэньня здабычы і спажываньня торфу ў якасьці паліва, як у прамысловасьці, так і ў камунальнай гаспадарцы.

X Усебеларускі Зьезд Саветаў абавязвае Ўрад Беларускай ССР і гаспадарчыя арганізацыі шырока разгарнуць торфаздабываньне на паліва, пераапрацоўку яго на кокс для мэталёвай прамысловасьці з тым, каб на працяму бліжэйшых 2-х год забясьпечыць ўдзельную вагу торфу ў паліўным балянсе прамысловасьці ня менш, як на 50 проц. Для гэтага Вышэйшы Савет Народнае Гаспадаркі абавязан палепшыць сыстэму здабычы торфу, мэханізацыю торфавывазкі, сваячасова весьці падрыхтоўку торфабалот, пераходзячы да мэханізацыі гэтае справы, а таксама паставіць у цэнтры ўвагі падрыхтоўку спажыўца да торфапаліва.

Разам з тым Зьезд Саветаў даручае Вышэйшаму Савету Народнае Гаспадаркі разгарнуць прамысловасьць па пераапрацоўцы торфу, скарыстоўваючы торф у якасьці сыравіны для цэлага шэрагу вытворчасьцяй.

24. Мэталяпрамысловасьць БССР, якая дасягнула значных посьпехаў, павінна і ў далейшым разгортвацца па шляху задавальненьня ў асноўным запатрабаваньняў народнае гаспадаркі Беларускай ССР. У апульным машынабудаўніцтве павінна пашырацца вытворчасьць торфа-машын, абсталяваньне для мэханізацыі, па вырабе будматар'ялаў і мэханізмаў, а таксама мэханізмаў для выкананьня дарожных і мэліярацыйных і торфяных работ.

У сельска-гаспадарчым машынабудаўніцтве трунтам зьяўляецца абслугоўваньне патрэб абагуленага сэктару сельскае-гаспадаркі, ў адпаведнасьці з сельска-гаспадарчай спэцыялізацыяй Беларускай ССР, у зьвязку з разгортваньнем калектывізацыі сельскае гаспадаркі, Зьезд Саветаў прапануе зьвярнуць больш увагі на вытворчасьць уборачных машын, асабліва па ільну і бульбе.

25. У галіне лясной гаспадаркі і прамысловасьці, якая грунтуецца на лясной сыравіне (дрэваапрацоўчая, папяровая, лесахэмічная), асноўнымі задачамі павінны стаць палепшаньне лясной гаспадаркі, рацыянальная арганізацыя і вядзеньне яе, асваеньне недастаткова асвоенных масываў а таксама скарыстаньне лясных адходаў. У адносінах лесаапрацоўкі і лесавывазкі, канстатуючы сусім незадавальняючае становішча з выкананьнем пляну, Зьезд Саветаў прапануе дабіцца правільнай арганізацыі працы, мэханізацыі работ, будаўніцтва чыгначных веткі, палепшаньня сплаўных шляхоў і мэханізацыі вывазкі.

Дрэваапрацоўчая прамысловасьць павінна разгортвацца, галоўным чынам, па шляху далейшага паселеньня пераапрацоўкі лясной сыравіны, больш паглыбленай арганізацыі і пашырэньня вытворчасьці будаўнічых дэталяй, зборных, дамоў, мэблевае вытворчасьці і г. д.

Адпаведна гэтаму Саюзлеспрам абавязан правесьці і капітальнае будаўніцтва. Разам з гэтым, асабліва ўвага павінна быць зьвернута на разьвіцьцё лесахімічнай прамысловасьці ад арганізацыі падсочкі да будаўніцтва каніфольна-экстрактных заводаў.

26. На грунце мясцовай мінэральнай сыравіны неабходна надалей шырока разгортваць вытворчасьць будаўнічых матар'ялаў для задавальненьня потрэбнасьцю мясцовымі будаўнічымі матар'ялами ня толькі патрэбы будаўніцтва Беларускай ССР, але-ж часткова і на вываз.

Шклянную прамысловасьць трэба правесьці на спажываньне пераважна мясцовых пяскоў і крэйды.

Выробленая Вышэйшым Саветам Народнае Гаспадаркі колькасьць штучнага ўгнаеньня (фасфарыт) не задавальняе запатрабаваньняў ўгнаеньня глебы саўгасаў і калгасаў, чаму Зьезд Саветаў прапануе Вышэйшаму Савету Народнае Гаспадаркі ўжыць рашучыя захады да разьвіцьця вырабу фарфарытаў.

27. Асаблівую ўвагу трэба надаць разьвіцьцю ільнапрацоўчай і канопляпрацоўчай прамысловасьці Беларускай ССР. Прымаючы пад увагу сельска-гаспадарчую спэцыялізацыю рэспублікі, павялічэньне плошчы засеву ільну і канапель і таварных выхадаў іх, а таксама разьвіцьцё штучнага пошуку у Беларускай ССР, павінна быць перагледжана праграма будаўніцтва прадпрыемстваў, якія пераапрацоўваюць гэтую сыравіну і запраектавана пабудова новых камбінатаў са скончаным цыклем вытворчасьці, а таксама праведзена рэарганізацыя існуючых камбінатаў.

28. Сельска-гаспадарчая спэцыялізацыя Беларускай ССР, як раёну жывёлагадоўлі і тэхнічных культур, забясьпечвае таксама сыравінную базу для далейшага разьвіцьця гарбарна-абутковай прамысловасьці.

Пры пашырэньні жывёлагадоўлі, у асаблівасьці сьвінагадоўлі, пры павялічэньні багатовак скур, гарбарна-абутковая прамысловасьць абавязана прыняць адпаведныя меры да пераапрацоўкі гэтае сыравіны. Неабходна пашырыць пераапрацоўку сьвіных скур шляхам пабудовы спэцыяльнага заводу, арганізаваць буйную сыраматную вытворчасьць, разьвіць новыя вытворчасьці па пераапрацоўцы фабрыкатаў (шорнасядзельная справа, галянтарэя і інш.).

29. Прамысловая кааперацыя павінна пасіліць выраб будаўнічых матар'ялаў, яшчэ больш разгарнуць лесахэмічны промысел, разьвіць выраб нескладаных сельска-гаспадарчых машын, частак і дэталей да сельска-гаспадарчых машын, рознага сельска-гаспадарчага інвэнтара (сані і коўты) для задавальненьня патрэб калектывізацыі сельскае гаспадаркі.

Адначасова больш рашуча разгарнуць фамонтна-папраўчую справу для задавальненьня патрэб насельніцтва (рабочых, калгасьнікаў) рэчамі шырокага спажываньня.

Максымальна ахапіць каапераваньнем вясковых саматужнікаў, асабліва ў калгасах.

Прапанаваць Вышэйшаму Савету Народнае Гаспадаркі, НКСнабу і мясцовым савецкім органам БССР аказваць прамысловай кааперацыі садзейнічаньне ў выкананьні пастаўленых задач.

30. X Усебеларускі Зьезд Саветаў, на падставе намечаных асноўных задач разьвіцьця прамысловасьці, даручае ўраду Беларускай ССР распрацаваць і зацьверджаць канкрэтны плян разгортваньня рэспубліканскай і мясцовай прамысловасьці і электрафікацыі, капітальнага будаўніцтва, забясьпечаньня мерапрыемстваў па паліўным балянсе.

Старшыня X-га Усебеларускага Зьезду Саветаў А. Чарвякоў.

Сакратар X-га Усебеларускага Зьезду Саветаў А. Хацкевіч.

28 лютага 1931 г.
г. Менск.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

23-III-31 г. а 7-ай гадз. увечары ў Доме Комасьветы адбудзецца паседжаньне камісіі партасьветы мэтадбюро ЦК КП(б)Б. Павінны зьявіцца наступныя тт. Модэль, Улазаў, Гаеўскі, Голанд, Гурвіч, Бухфілаў, Яцкевіч, Орліс і Макоўскі.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

24 сакавіка роўна а 19 гадзіне ў памяшканьні Цэнтральнага Архіўнага Кіраўніцтва БССР (вул. Энгельса, 26, 3-ці паверх, пакой № 22)

адбудзецца

ПАСЕДЖАНЬНЕ САВЕТУ

пры загадчыку Цэнтральнага Архіўнага Кіраўніцтва БССР

з абвесткай дню:

1. Справаздача Цэнтральнага Архіўнага Кіраўніцтва БССР за 1929-30 г.
2. Бягучыя спр вы.

Яўка членаў савету абавязковая.

Загадчык Цэнтральнага Архіўнага Кіраўніцтва А. Іодка.

Менскі ЗАГС выклікае гр-на Стрэлкова Ігната Юркава на 28 сакавіка 1931 г. па справе скасаваньня шлюбу з гр-кай Стрэлковай Вольгай Мікалаевай.

Менскі ЗАГС выклікае гр-на Глінскага Івана Станіслава на 3 красавіка 1931 г. па справе скасаваньня шлюбу з гр-кай Глінскай Сьцепанідай Хведаравай.

Менскі ЗАГС выклікае гр-на Гарбаценка Яўхіма Данілава на 28 сакавіка 1931 г. па справе скасаваньня шлюбу з гр-кай Гарбаценкай Зоояй Адамавай.

ТЭАТР-КІНО

Беларускі Другі Дзярж. тэатр — Апошнія два адкрытых спэктаклі „РЭЙКІ ГУДУЦЬ" п'еса ў 5 дзеях, 9 абразох. Пачатак а 8 гадзіне.

З ПАНЯДЗЕЛКА 23-га САКАВІКА

„Чырвоная Зорка"	2 БУЛЬДЗІ 2. Звыш праграмы СУД ІДЗЕ (о равн ЦК РСДРП (меншавіко ў). Пачатак а 7 г., 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв. Каса з 5 г.
Кіно-тэатр „Культура"	Замежны фільм П О Р Ы. Звыш праграмы СУД ІДЗЕ (справа ЦК РСДРП меншавікоў) Пач. а 7, 8.45 і 10.30 Каса адч. з 5 гадз.
Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"	Замежны фільм. СКРЫПАЧ з ФЛОРЭНЦЫІ Пач. 1 сэансу а 6 гадз. Каса адч. з 4 г.
Кіно „ПРАЛЕТАРЫ"	Новы савецкі фільм РАЗВОД Хроніка Саюзкіно № 8. Пач. 1 сэансу а 6 гадз. Каса адч. з 4 гадз.
Кіно „Юны Піянэр"	Мастацкі фільм. ЗАКОН ГОР. Драма ў 8 частках. Пачат. сэансу а 1 г. Каса адч. з 12 гадз.

Магілеўская школа ФЗВ (Камбінат) скуранай прамысловасьці з 2 аддзяленьнямі

РЫМАРНА-СЯДЗЕЛЬНЫМ І СКУРАНЫМ

абвяшчае прыём заяў на 1 курс па абодвых аддзял. з 13-III па 1-IV—31 г.

Прымаюцца асобы ад 14—18 гол. Асобы, якія скончылі курс 5-ц груп сямігодкі і больш—прымаюцца бяз іспытаў, скончыўшыя 4 групы—праходзяць іспыты.

Да заявы прыкладаюцца наступныя дакуманты:

1. Анкета па форме, якая ўстаноўлена для ФЗВ. заверана прафэсыянальным, або савецкім органам;
2. Дакумант аб узросьце (мэтрыка);
3. Дакумант аб асьвеце;
4. Даведка аб стане здароўя;
5. Даведка аб сацыяльным і матар'яльным становішчы: для сялян—даведка аб уплаце с-г падатку; для калгасьнікаў—даведка аб уступленьні ў калгас;
6. Даведка аб праве выбарчага голасу;
7. 2 фатаграфічных карткі.

У гэты набор будзе прынята 175 чалавек.

Усе прынятыя забясьпечваюцца зарплатай 20—30 руб. у месяц.

Інагароднім будзе прадастаўлены інтэрнат.

Заявы накіроўваць: *Магілеў, Бел. школа ФЗВ (камбінат) скуранай прамысловасьці, Ленінская вул. № 43.*

Да заявы прыкладаюцца паштовыя маркі на 25 кап. для адказу аб прыёме

Заг. ФЗВ скуранай прамысловасьці ПІНСКІ

Абавязковая пастанова № 4

Менскага Гарадзкога Савету Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў

Гор. Менск.

Аб часе запальваньня дамавых ліхтароў.

Менскі Гарадзкі Савет Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1) Устанавіць наступны час запальваньня і гарэньня дамавых ліхтароў.

МЕСЯЦЫ	Час запальваньня	Час тушэньня (не раней)
Люты	18 г.	5 г. 30 хв.
Сакавік	19 г. 30 хв.	4 г. 30 хв.
Май	21 г.	3 г.